Чыгуначнікі Жлобіна адказваюць на пастанову ЦК КП(б)Б—

Прапетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 257 (4203)
Субота, 31 кастрыч. 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

НОВЫМ УЗДЫМАМ вытворчага энтузіязму

САСТАВІЦЕЛІ, СЦЭПШЧЫКІ . СТРЭЛАЧНІКІ ПАЧАЛІ БАРАЦЬБУ ЗА БЕСЬПЕРАБОЙНАЕ ПРАСОУВАНЬНЕ ГРУЗАЎ ПЯЦІГОДК

ЛЕПШАЙ АРГАНІЗАЦЫЯН ДЫСПЭТЧАРСКАЙ СУВЯЗІ ДАБІЦЦА СКАРАЧЭНЬНЯ ПРАСТОЯЎ ВАГОНАЎ

Маршрутызацыя і спецыялізацыя цягнікоў—адзін з асноўных і магутных фактараў паляпшэньня работы вагоннага парку. Для асеньня-зімовых перавозак правільная арганізацыя гэтай галіны работы мае выключнае значэньне для паскарэньня прасоўваньня грузаў.

Жлобінскі вузел — буйная магістральная лінія, праз якую праходзяць грузапатокі на поўнач і поўдзень. Тут выразная маршрутызацыя і спецыялізацыя адыгрывае асаблівую роль.

Сёньня атрымлівае слова ст. Жлобін — цэнтральная, якая за ўдарную работу атрымала першую дарожную прэмію і выстаўлена кандыдатам на ўсесаюзны конкурс на лепшае дэпо, станцыю, аколодак.

Намесьнік начальніка станцыі па масавай рабоце тав. **Крук** выкрывае нам арытмэтыку перамог. Загад наркому шляхоў зносін тав. **Андрэева** даў значны штуршок у паляпшэньні работы ст. Жлобін па асноўных паказальніках. У верасьні каэфіцыент манэўровай работы выканан на 101,67 проц., спецыялізацыя цягнікоў — на 100 проц., маршрутызацыя — 94,99 проц., поўнаважнасьць цягнікоў — 99,62 проц. Ня здаючы тэмпы і ў кастрычніку. За першую дэкаду вымяральнікі па маршрутызацыі выкананы на 98,73 проц., спецыялізацыі — на 98,5 проц. Палепшылася і якасьць маршрутызацыі.

Станцыя дабілася ліквідацыі абязьлічкі. Паравозы прымацаваны да поўных паркаў, а да кожнага паравоза і парку прымацаваны саставляючыя брыгады сцэпшчыкаў. Стрэлачнікі маюць поўныя пасты. Кожная саставляючая брыгада ведае напрамак тэй ці інш. трупы вагонаў, а таксама ведае машыніста паравоза. Раней-жа саставіцелі працавалі на розных парках, з рознымі машыністамі. У выніку ліквідацыі абязьлічкі дасягнуты значныя посьпехі ў выкананьні вымяральнікаў на маршрутызацыі і спецыялізацыі.

Цікавы вопыт работы на скарчэньні прастою вагонаў пад сартавальным грузаў. У дапамогу вагаўшчыкам уведзена пасада прыёмшчыкаў. Гэтым самым упрашчэньнем тэрмін сартаваньня і вызваляецца лішак паражняка для іншых апэрацый. Так, у верасьні з уведзеньнем прыёмшчыкаў удалося адрымаць лішак у 29 вагонаў, а за 20 дзён кастрычніка — 22 вагоны. Такім чынам вагоны, замест навыгоднага прастою знаходзяцца ў руху яшчэ 2 гадзіны і робяць за гэты час дзесяткі кілямэтраў прабегу.

Ня менш важнае значэньне набывае правільнае і поўнае выкарыстаньне пад'ёмнай сілы вагона. Раней нагрузка вагона простага напрамку складала 6 тон, цяпер — 7,4 тоны, вучасткоага дробнага грузу адпаведна — 5,8 тоны. Амаль зусім спынілася засылка грузаў, якія лічыліся да апошняга часу сапраўдным злом станцыі. Лік гэтых засылак у месяц дасягнуў 200 выцалкаў, што выклікала лішнія перавозкі і бытаткі.

З 22 кастрычніка станцыя пачала практычнае ажыцьцяўленьне ведуч указаньняў тав. Андрэева. Выдуманы намесьнік нач. станцыі і два тэхнікі, якія займаюцца выключна вытаўнымі марш рутызацыі і спецыялізацыі цягнікоў. Для лепшай увагі работы устаноўлена ўстанаўляецца вузлавая дыспэтчарская сувязь. Вузлавы дыспэтчар ведае мець на вузле 4 тэлефонныя пасты, якія непасрэдна зьвязуць тэлефонам дыспэтчера з дажурнымі па станцыі і пастамі нямін сабою. Ажыцьцяўленьне вузлавой дыспэтчарскай сувязі дасьць магчымасьць правесьці рад мерапрыемстваў па скарачэньні прастояў вагонаў і зьнішчыць у гэтай галіне многія вытворчыя нявужкі.

Барацьба з ураўнілаўкай, увядзеньне прэміяльнай сыстэмы мела значны ўплыў на ўзьнікьцце прадукцыйнасьці працы. Так, ранейстрэлачнік на ўсіх пастох атрымліваў адноўкава на 66 руб. у месяц, цяпер стрэлачнік на лёгкім посту атрымлівае 70 руб. 96 кап., сярэднім — 75 руб. 07 кап., дзяжкім — 84 руб. 81 кап. Сцэпшчык, замест аднолькавай стаўкі для ўсіх 85 руб. 20 кап., атрымлівае адпаведна рабоце — 91 р. 50 к., 97 руб. 98 кап. і 110 руб. 76 кап. Саставіцель — 118 руб. 68 кап., 127 руб. і 143 руб. 52 кап. Загадчык манэўровай работы замест ранейшых 123 руб. атрымлівае 153 руб. 53 кап. — пры ўмове выкананьня вымяральнікаў. Дзяжурны па станцыі замест 146 руб. 30 кап. — 224 руб. 37 кап. пры ўмове выкананьня заданьня. Тут, аднак, ёсьць вельмі вялікая разьбежка ў аплаце дзяжурнага па станцыі і загадчыка манэўровай работы. Апошні фактычна зьяўляецца памочнікам дзяжурнага, а па зарплаце значна ніжэй гэтай пасады.

Апошнія дырэктывы партыі і ўраду і загад тав. Андрэева выклікалі новую хвалю сацспаборніцтва і ўдарніцтва. На станцыі 90 проц. ударнікаў, сацспаборніцтвам ахоплена 95 проц. працуючых.

Хто-ж зьяўляецца найлепшымі ўдарнікамі? Вось іх імёны:

Шыбінскі Д. — саставіцель, кандыдат партыі, на транспарце 19 год, парушэньня працдысцыпліны ня меў, зьяўляецца прыкладным на зьмене. Шыбінскі рацыянальна выкарыстоўвае манэўровыя саставы. У верасьні ён адпраўў на раскладзе 97 проц. цягнікоў, каэфіцыент манэўровай работы выканаў на 101,6 проц., маршрутызацыю — на 100 проц., спецыялізацыю — на 100 проц., поўнаважнасьць цягнікоў—на 100 проц.

Лазебнікаў М. — саставіцель, беспартыйны, на транспарце 21 год, лепшы ўдарнік у зьмене, актыўны работнік трыкутніка. Вымяральнікі на адпраўленьне цягнікоў па раскладзе ў верасьні выканаў на 99,65 проц., манэўровым каэфіцыенце — 102 проц., маршрутызацыі — 100 проц., спецыялізацыі — 100 проц.

Кузьняцоў Ф.—стрэлачнік, цяпер выконвае абавязкі сцэпшчыка, член партыі, актыўны ўдзельнік вытворчай работы трыкутніка. Вымяральнікі па манэўровай рабоце ў верасьні выканаў на 102 проц., па адпраўленьні цягнікоў па раскладзе — на 97 проц., маршрутызацыі — на 85 проц., спецыялізацыі — 100 проц.

Глазоўскі І. — сцэпшчык, беспартыйны, лепшы ўдарнік у зьмене. У верасьні выканаў амаль усе вымяральнікі на 100 проц.

Хромаў І. — загадчык манэўровай работы (цяпер пераведзены ў Магілеў), член партыі, лепшы ўдарнік у зьмене, актыўны ўдзельнік вытворчага жыцьця. У зьмене, дзе Хромаў працаваў, амаль усе вымяральнікі выканаы на 100 проц.

Трыкутнік ст. Жлобін па-ўдарнаму перабудоўвае сваю работу. Кожная зьмена мае свой трыкутнік. Апошні налічваецца на станцыі 8. На сартовачнай, на групе білетных і багажных касіраў, дзе трыкутнікаў няма, выдуманы парт-арганізатары. Нізавыя трыкутнікі, парт-арганізатары перыядычна даюць справаздачы аб сваёй рабоце. На зьменах перад пачаткам работы практыкуюцца 5-мінутныя вытворчыя нарады, дзе зьменныя заданьні даводзяцца да кожнага работніка.

У рабоце станцыі ёсьць і некаторыя недахопы. Невыстарчальнае, напрыклад, вядзецца барацьба за ўзьнікьцце кваліфікацыі работнікаў. Не наладжан як належыць графік руху цягнікоў і г. д.

Станцыя Жлобін не навінна здаваць тэмпы і надалей. На падставе вопыту, які ўжо ёсьць, трэба зьнішчыць усе перашкоды на шляху разьвіцьця маршрутызацыі.

Жлобінскія чыгуначнікі павінны забясьпечыць бесьперабойнае прасоўваньне грузаў пяцігодкі.

Брыгада друку:

МІХ. КІН, СТОЛІН. МАШНІЦКІ, ЖМУДЗЕЦКІ.



Паравоза-зборачны цэх Каломенскага заводу

Вопыт жлобінскай сартовачнай

Прапанова т. т. Ранта і Жураўскага дае звыш 30.000 руб. эканоміі ў год

Масавая засылка грузаў прыносіць дзяржаве надзвычай вялікія страты. Тэлеграмы, адносіны аб «грузах, якія заблудзіліся», адрываюць асноўных работнікаў эксплёатацыі транспарту ад іх непасрэднай работы—кіраваць рухам цягнікоў.

Рабочыя і служачыя Жлобінскай сартовачнай пачалі барацьбу з гэтым станоўішчам. Таварышы **Рант і Жураўскі** на вытворчай нарадзе грузчыкаў і вагароў унесьлі прапанову: наставіць работу так, каб **не адпускаць грузаў ад дакумэнтаў у часе сартоўкі.** Гэта прапанова прынята і ўжо дала дадатныя вынікі. Напрыклад, на Жлобіне ўсе вагоны забраліся з сартовачнай не раней, як у 22 гадзіны, а зараз штодзенна забіраюцца да 12 гадзін па 3-6 вагонаў і ў 17 гадзін—па 22 вагоны. Улічваючы кошт прастою вагону ў гадзіну 50 кап. гэта дае эканоміі **2.595 руб. у месяц або 31.140 руб. у год па аднэй Жлобінскай станцыі.**

Работа па-новаму зьмяніла засылку грузу на 90 проц. Зьнікліся колькасьць тэлеграм і адносін аб адпусканьні грузаў з 30-50 штодзенна да 5-7. Амаль зусім зьнішчаны пакражы грузаў. Павялічылася загружанасьць вагонаў з 6 да 7,3 тоны ў сярэднім на вагон. Павярэдняя падлікі даюць станцыі Жлобін эканоміі ў год каля 45-50 тыс. руб. у той час, як на аплату новых прыёмшчыкаў станцыя выдаткуе ня больш 6.000 руб. у год.

Вопыт Жлобінскай сартовачнай павінен быць перакінут на ўсе сартовачныя рамы нашых чыгуначных вузлоў і буйных станцый.

А. Самаль.

Перамога жлобінскага дэпо

КОЛЬКАСЬЦЬ ХВОРЫХ ПАРАВОЗАЎ НА 7,34 проц. НІЖЭЙ ЗАДАНЬНЯ

Работнікі **Жлобінскага** дэпо ўключыліся ў правядзеньне сталінскай эстафэты. Для пасьпяховага выкананьня пастаўленых задач выначан рад канкрэтных мерапрыемстваў; поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку і ураўнілаўку, ліквідаваць пашкоджаньні намоту паравозаў і вагонаў, змагацца за 100-процэнтнае ажыцьцяўленьне сакрамэнтнага вады, узьняць на адпаведную вышыню працдысцыпліну, дабіцца эканоміі паліву змазачных і абтоўных матэрыялаў да 15 да 20 проц.

Рабочы калектыў узяў на сябе абавязацельствы да Кастрычніцкіх сьвятаў выпіць пляну адрамантаваць **2 паравозы і 4 вагоны.** Паравоз № 4.299 і два вагоны ужо адрамантаваны.

У выніку ўдарнай работы па выкананьні трансфінпляну работнікі дэпо дабіліся значнага зьнижэньня колькасьці хворых паравозаў. У першай палове кастрычніка гэта лічба зьменшана на **7,34 проц. ніжэй заданьня.**

МАШНІЦКІ.

Транспартная кампэрацыя недаатрымала тавараў

Паказальны дырэктыўных органаў аб бесьперабойным забесьпячэньні чыгуначнікаў ня выконваецца. За трэці квартал транспартная кампэрацыя Жлобінскага раёну недаатрымала тавараў на апытную суму. Белкавпасаюз і транспартсэкцыя Цэнтрасаюзу ня выконваюць сваіх пагадненьняў.

Да гэтага часу не наладжана (за выключэньнем мазыршу № 1 у Жлобіне) пераважнае забесьпячэньне ўдарнікаў.

Вагоны-крамы бываюць на буйных станцыях вельмі рэдка.

Ня лепшае становішча і ў прыгараднай гандлярцы Жлобінскага транспартнага кампэратыву. Часткка гародніны—каля 25 проц. бульбы і 30 проц. моркаўны—ня ўбрана і папсавалася.

Трэба ўсьцяж рад мер для ліквідацыі буйнейшых недахопаў у рабоце Жлобінскага РТОТ.

Машніцкі.

Па-бальшавіцку правесьці справаздачную кампанію саветаў

Справаздачная кампанія саветаў БССР разгортваецца ў пэрыяд завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі, калі да канца трэцяга рашаючага году пяцігодкі засталіся толькі два месяцы.

За 9 месяцаў, якія прайшлі з часу перавыбараў саветаў, БССР дабілася вя лікіх посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве, посьпехаў, дасягнутых, дзякуючы няўхільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі, жорсткай барацьбы з ухілам ад яе, дзякуючы самаму актыўнаму ўдзелу ў будаўніцтве і кіраўніцтве дзяржавай шматмільённых мас працоўных.

Нашы посьпехі настолькі вялізарныя, што навет непрымірымыя ворагі Савецтаў вымушаны прызнаць, што ніколі сьвет ня бачыў яшчэ такой гігантскай будоўлі. Якімі нікчэмнымі выглядаюць зараз прароцтвы апартуністычных элементаў аб надмернасьці узятых партыяй тэмпаў!

На аснове разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва, пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ЦК, БССР дасягнула нячуваных раней тэмпаў індустрыялізацыі краіны. Затры кварталы 1931 прамысловасьць БССР дала прадукцыі на 43 проц. больш, чым за тры кварталы мінулага году.

Посьпехі індустрыялізацыі далі магчымасьць атрымаць вялікія перамогі на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Каля 50 проц. бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак аб'яднаны ў калгасы. Тысячы трактараў зьнішчаюць межы індывідуальных палосак. Кожная новая дасягненьне на фронце калектывізацыі і індустрыялізацыі павышае матэрыяльна-бытавыя ўмовы рабочай клясы і калгаснага селянства.

Няўхільна расьце культурны і гаспадарчы ўздым працоўных усіх нацыянальностэй БССР.

Нашы грандыёзныя посьпехі асабліва вызначаюцца на фоне жорсткага крызісу, які падрывае асновы капіталістычнага ладу.

Дасягненьні ў сацыялістычным будаўніцтве яшчэ раз даказваюць, што толькі ў краіне дыктатуры пралетарыяту, у краіне Саветаў магчымы такія высокія тэмпы разьвіцьця, аб якіх на можа мець капіталістычны сьвет.

Вялізарную ролю ў барацьбе за бальшавіцкія тэмпы адыгралі нашы саветы — органы дыктатуры пралетарыяту, якія залучаюць мільёны масы працоўных з авангардам пралетарыяту (Сталін), дзяржаўнічаюць і скарыстоўваюць валюнтарную актыўнасьць, энтузіязм і творчую энергію рабочай клясы, калгасных і іншых працоўных мас на вырашэньне пастаўленых перадавых задач пабудовы сацыялізму.

9 месяцаў назад, на пэрозе трэцяга рашаючага году, калі праходзілася перавыбары саветаў, партыя з усёй рашучасьцю паставіла рад вялікіх задач перад новым складам саветаў:

— ПЕРАБУДАВАЦЬ УСЮ РАБОТУ АДПАВЕДНА НОВЫМ ЗАДАЧАМ РЭКАНСТРУКЦЫЙНАГА ПЭРЫЯДУ, ПРАВОДЗІЦЬ РАБОТУ НЕПРЫМІРЫМАЙ БАРАЦЬБОЙ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ, рашуча змятаючы з апартунізмам і бюрократызмам, ўлядаць і накіраваць па патрэбным рочыстым шляху ініцыятыву працоўных, сапраўды пазбавіўшы таварам да выкананьня прамфінпляну і арганізацыйна-гаспадарчага ўзмацненьня калгасаў, стаць на чале руху асноўных мас селянства ў калгасах, асноўным чынам палепшыць культурна-бытавое абслугоўваньне мас.

Саветы зьяўляюцца галоўнымі вагарамі пралетарскай дыктатуры. Яны павінны сустрымаць, выхоўваць, навучаць і весьці за сабой усю гігантскую масу прыгнечаных раней клясаў» (Ленін). Гэты вагар павінен быць шырока скарыстаны для завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

ПРАВЕРЦЫ, ЯК САВЕТЫ БССР НА ПРАКТЫЦЫ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЮЦЬ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ, ЯК МАБІЛІЗУЮЦЬ ЯНЫ МАСЫ НА БАРАЦЬБУ ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ—ПРЫСЬВЕЧАНА СПРАВАЗДАЧНАЯ КАМПАНІЯ І АГЛЯД РАБОТЫ САВЕТАЎ, ЯКІ ЗАРАЗ ПРАВОДЗІЦЦА.

Пасылаючы ў саветы сваіх лепшых прадстаўнікоў — перадавых рабочых ударнікаў, энтузіястаў пяцігодкі, перадавых калгасьнікаў,—працоўныя масы ў сваіх наказах далі разгорнутую праграму работы саветаў на бліжэйшы пэрыяд. СПРАВАЗДАЧНАЯ КАМПАНІЯ ПАВІННА ВЫЯВІЦЬ, ЯК ВЫКОНВАЮЦЬ САВЕТЫ ВОЛЮ МАС ВЫБАРШЧЫКАЎ, ЯК ЗМАГАЮЦЦА ЯНЫ ЗА ЎЗДЫМ КУЛЬТУРНА - БЫТАВЫХ УМОЎ ПРАЦОЎНЫХ, ЯК АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЮЦЬ ЯНЫ ДЫРЭКТЫЎНЫЯ ПАКАЗАНЬНІ ТАВ. СТАЛІНА.

Справаздачная кампанія Менгарсавету, праведзеная ў жніўні-верасьні г. г. паказала, што менскі гарадзкі савет яшчэ не дабіўся рашучай перабудовы сваёй работы, яшчэ не павярнуўся поўнасьцю тварам да заводаў, не разгарнуў масавай работы, ня прыняў энэргічных мер да ажыўленьня работы сэкцый і дэпутацкіх груп—тых звеньняў, якія зьвязваюць саветы з масамі выбаршчыкаў

Агляд работы бабруйскага, аршанскага, рэчыцкага і іншых гарадзкіх саветаў паказаў, што рад саветаў далёка ня поўнасьцю справіліся з задачамі перабудовы сваёй работы, каб забясьпечыць кіруючую ролю ў барацьбе за бальшавіцкія тэмпы. Дэпутацкія групы на прадпрыемствах у большасьці працуюць вельмі слаба, не адчуваюцца на заводзе, як застрэльшчыкі змаганьня за прамфінплян.

Сэкцыі некаторых гарадзкіх і сельскіх саветаў праяўляюць яўную апартуністычную бязьдзейнасьць, не змагаюцца за выкананьне прамфінпляну, за перабудову работы кампэрацыі, за арганізацыю працы ў калгасах. Рад сельсаветаў яшчэ не ачысьціўся канчаткова ад апартуністаў, клясава-варожых элементаў, ад работнікаў, якіх ня цураюць лінію партыі, дрэнна вядуць арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў, ходам загатовак, мабілізацыяй сродкаў і г. д.

Спажывецкая і рэакцыя настрої, выяўленыя ў апошні час у радзе калгасаў, якія (настрої) стварыліся клясавым ворагам на тэрыторыі сустрэлі разучаньне і рашучага адпору, але нагрымаліся дасаобнымі работнікамі сельсаветаў. Гэтыя работнікі па сутнасьці зьявіліся агентамі кулака ў савецкім апараце. У апублікаванай учора пастанове бюро менскага гаркому КП(б)Б і прэзыдыуму ГарКК адзначана, што пры зьдыўмы раду сельсаветаў: Сэніцкага, Калодзішчанскага, Замастоцкага, Апачацкага, Строчынскага сельсаветаў дапусьцілі зрыў кампаніі па загатоўках, не прынялі ніякіх мер да спагнаньня цьвёрдых заданьняў і сваёй бязьдзейнасьцю патуралі клясаваму ворагу, які імкнуўся распаляць спажывецкія настрої сярод адсталых груп калгасьнікаў і гэтым разваліць калгас з сярэдзіны.

Справаздачная кампанія саветаў павінна выкрыць апартуністаў, агентаў клясавага ворага ў савецкім апараце і рашуча ачысьціць саветы ад асоб, якія зрываюць ажыцьцяўленьне генэральных задач, вызначаных ленінскай партыяй, зрываюць ПЕРАБУДОВУ работы саветаў на аснове тых НОВЫХ задач, якія стаяць перад намі.

Першыя весткі аб ходзе справаздачнай кампаніі, якая зьвязана з масавым аглядам саветаў, гаворыць аб УЗДЫМЕ НОВАЙ ХВАЛІ АКТЫЎНАСЬЦІ ПРАЦОЎНЫХ МАС. На справаздачных сходах, на мітынгах рабочыя і калгасьнікі разгортваюць жорсткую самакрытыку пасобных прарываў у рабоце саветаў. Вялікую ролю ў актывізацыі мас, у разгортваньні далейшай перабудовы работы саветаў адыгрывае САЦСПАБОРНІЦТВА ЗА МЕСЦА Ў «ЧЫРВОНАЙ КНІЗЕ РАПАРТОЎ САВЕТАЎ, якое пачалося па ініцыятыве газэты »САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ».

Выклік Мазырскай міжраённай нарады саветаў жывёлагадоўчых раёнаў падхоплен радам саветаў БССР. Сацспаборніцтва ператвараецца ў барацьбу за поўнае ажыцьцяўленьне вожнейшых задач, якія стаяць зараз перад саветамі ў справе ГАСПАДАРЧАГА ЗАМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ — цэнтральнай і важнейшай задачай, у справе разьвіцьця жывёлагадоўлі, і выкананьня плянаў і інш.

РЭЧЫЦКІ гарадзкі савет, напрыкпад, прыняў на сябе абавязацельства арганізаваць дэпутацкія групы на асноўных прадпрыемствах, сыстэматычна кіраваць імі, ажыцьціць работу сэкцый гарсавету і сельсаветаў, стварыць групы беднаты пры сельсаветах, поўнасьцю выканаць пляны асеньніх кампаній. БАБРУЙСКІ гарсавет абавязаўся мабілізаваць увагу саветскага актыву на перавыкананьне прамфінпляну, уцягнуць усіх дэпутатаў ва ўдарныя брыгады, да весьці колькасьць дэпутацкіх груп да 20 і г. д.

Нарады сельсаветаў ільнаводчых і жывёлагадоўчых раёнаў, якія адбыліся ў Віцебску і Мазыры, таксама ўзялі рад абавязкоў у адносінах узмацненьня масавай работы саветаў.

Аднак, ужо зараз ёсьць рад фактаў, якія сьвядчаць аб тым, што справаздачная кампанія далёка ня ўсюды разгорнулася, як МАСАВАЯ кампанія. У ВОРШЫ праведзены тры справаздачныя сходы; яны паказалі, што мясцовыя органы аддаюць гэтай рабоце вельмі мала ўвагі: яўка была нездавальняючай, на справаздачны сход Хлебазаводу зьявілася толькі 15 проц. рабочых. У ЛЕЗЬНЕ на вучасткавыя сходы зьяўлялася па 10-20 чал. з 200-300. З 4-х правераных брыгад ні адна не працавала. Такім малюкам нагадзеецца ў сельсаветах Жлобінскага і Магілёўскага раёнаў. Гэта выміг СЛАБОЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДА КАМПАНІІ, НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ МАСАВАЙ РАБОТЫ ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПОЎНЫ ЎДЗЕЛ ВЫБАРШЧЫКАЎ У СПРАВАЗДАЧНАЙ КАМПАНІІ, ПАМЯТАЮЧЫ, ШТО СПРАВАЗДАЧЫ САВЕТАЎ — АГЛЯД ІХ БАРАЦЬБЫ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ; партарганізацыі павінны дапамагчы разгортваньню сацспаборніцтва саветаў за месца ў «Чырвонай кнізе».

Вялікае значэньне ў галіне перабудовы работы саветаў мае выдадзеная апублікаваны ліст ЦК і ЦКК КП(б)Б і ЦОПСБ аб пашырэньні праў сэкцый саветаў, аб ажыўленьні работы дэпутацкіх груп. Гэты ліст павінен быць положан у аснову ўсёй работы па перабудове масавай працы саветаў.

Шырока разгортваючы справаздачную кампанію саветаў, поўнасьцю выпаўняючы ўсе дадатныя і слабыя бакі работы саветаў, канцэнтруючы ўвагу мас на АСНОЎНЫХ і ГАЛОЎНЫХ пытаньнях нашай работы — яшчэ вышэй узьнімем сьцяг барацьбы за ажыцьцяўленьне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага наступленьня.

Што нясуць з сабою „цьвёрдалобыя"

Напярэдадні выбараў Гендэрсон заявіў, што ён быў-бы задаволены, калі-б «рабочая» партыя страціла-б 100 мандатаў. **Вынікі выбараў перавысілі самыя сумныя чаканьні ангельскіх рэфармістаў.** Выбары прынесьлі катастрафічны разгром ангельскаму сацыялфашызму, пачынаючы ад самых «левых» яго адценьняў, канчаючы правым нацыянал-лэйбарыстскім крылом, на чале якога стаяў Макдональд. Лэйбарысты страцілі звыш 3 млн. галасоў і атрымалі замест 289 мандатаў толькі 50.

Паўтара гады прабываньня ва ўладзе «рабочага» ўраду аказаліся зусім выстарчальнымі для таго, каб выбарчыя перамогі лэйбарыстаў 30 мая 1929 г. закончыліся страшэнным ліквідацыяй 27-га кастрычніка 1931 г.

Габінэт «рабочай» партыі вырыў да канца на толькі самога сябе, але і ўвесь ангельскі «канструкцыйны сацыялізм», гэтую машэніцкую дактрыну, створаную для знаку мас. Бясслаў нас надзеньне «рабочага» габінэту Макдональда і добраахвотная перадача ўлады «нацыянальнаму ўраду» толькі давершылі гэты працэс самакрышэньня і надвялі канчатковыя вынікі кіраваньня лэйбарысцкага габінэту.

Пад ударамі самага цяжкага ў гісторыі ангельскага капіталізму эканамічнага крызісу, лэйбарысцкія правадыры не знайшлі іншага выхаду з тупіка, як адкрытае братаньне з Балдуінам, як прыняцьце ўсіх капіталістычных рэцэптаў «лячэньня» сьмяротна хворага капіталізму, якія звялі на нагалоўнага рабаваньня працоўных мас.

Масы з агідпасьцю адвярнуліся ад усіх гэтых лэйбарысцкіх лёкаяў. Гэта тлумачыцца таксама тым, што ў пэрыяд выбараў барацьбы адбылося далейшае ўзаемнае самазмярыцьцё нацыянал-лэйбарыстаў і новаяўленай «апазыцыі» Гендэрсона. Сноўдэн, Томас і нават сам Макдональд чорным па беламу даказалі, што гэтыя самыя «апазыцыянэры», будучы тыдзень таму назад у габінэце, выяўлялі першаклясную ініцыятыву ў справе ўнясьненьня прапаноў для выратаваньня ангельскага капіталізму за кошт рабаваньня шырокіх працоўных мас.

Вялікі ангельскі пісьменьнік **Бернард Шоу** правільна заўважыў асноўнае ў настроях ангельскіх выбаршчыкаў: **«Гэта — ня выбары, гэта — панічнае бегства».** І сапраўды цяперашнія выбары — гэта выбары, якія дыктуюцца панікай. Рашаючую ролю ў перамозе кансэрватараў адыграў, відавочна, таксама надзвычайны зманшырокіх мас, які ажыцьцяўлялі кансэрватары, абяцаючы масам выхад з крызысу ўвядзеньцем высокіх пратэкцыяністкіх тарыфаў. Кансэрватары заяўлялі, што акружэньне ангельскай прамысловасьці высокімі мытамі паслужыць **ажывіцельным падскурным для паразытычнага арганізму ангельскага капіталізму,** гэтым прыладзе да зьнішчэньня беспрацоўя, а галоўнае да аднаўленьня залатога стандарту — фунта стэрлінгаў, да звароту Англіі на тое месца, якое яна займала «у добрыя часы» брытанскага ільва.

Але паветраныя замкі кансэрватараў пабудаваны на зыбкай глебе. Увядзеньне пратэкцыяністкіх мыт выкліча сустрэчныя мерапрыемствы з боку эўрапейскіх дзяржаў і Амэрыкі, якія ўзьвялуць таксама **агарадзіцельныя сьцены супроць ангельскага імпэрту.** Замест зьнішчэньня беспрацоўя гэта прынясе яго павялічэньне. Апрача гэтага, гэта азначае мацнае павышэньне цэн на прадукты харчаваньня, якія ў большасьці ўвозяцца ў Англію і такім чынам — далейшае зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню мас, зьніжэньне рэальнай заработнай платы ўжо і без таго зьніжанай інфляцыяй, якая расчалася.

Прыход да ўлады кансэрватараў азначае разгорнутае наступленьне на палітычныя правы і жыцьцёвы ўзровень рабочай клясы. Гэта прывядзе да **далейшага абвастраньня клясавай барацьбы ў самой Англіі.** Рабочыя масы, якія ўжо выходзяць на вуліцу, у 100 тысячных дэманстрацыях, якія аказваюць свой рэвалюцыйны ўплыў на ангельскі флёт і армію, узьнімуць хвалю контрнаступленьня.

Надзвычайнае значэньне маюць ангельскія выбары для міжнароднага становішча. Да ўлады ў Англіі ідуць самыя махровыя прадстаўнікі рэакцыі, самыя заяўчныя правадыры брытанскага імэрыялізму. Асабліва ў цяперашніх умовах моцнага абвастраньня ўсіх супярэчнасьцяй у лягеры імэрыялізму, ва ўмовах пячуванага эканамічнага крызысу гэта азначае, што пытаньне аб новым перадзеле сьвету будзе пастаўлена з асаблівай вострасьцю, што з новай сілай выбухне асноўны антаганізм у капіталістычным сьвеце на даным этапе — англа-амэрыканскія супярэчнасьці. **Небясьпека новай імпэрыялістычнай вайны становіцца непасрэднай, як ніколі яшчэ пасьля сусьветнай імпэрыялістычнай вайны.**

Асаблівыя прычыны для ўзмоцненнай пільнасьці маюць **працоўныя Савецкага Саюзу і ўсяго сьвету. Самыя заядлыя ворагі Савецкага Саюзу, нястомныя арганізатары блёкады і інтэрвэнцыі супроць краіны Саветаў,** кіруюць дзяржаўным старном Англіі. **Узрастае небясьпека антысавецкіх інтрыг і авантур.**

Прыход да ўлады «цьвёрдалобых» пацягне за сабою абвастраньне клясавай барацьбы як у Англіі, так і ў іншых краінах, якая нямінуча пацягне за сабою рост рэвалюцыйнага ўздыму, і служыць штуршком для далейшага пасьляваньня рэвалюцыйнага крызису.

175.000 тон бульбы—Ленінграду

Засталося адгрузіць яшчэ 57.000 тон

Неадкладна ліквідаваць запазычанасьць перад пралетарамі Ленінграду. Раўняючыся папярэдавых адстаючыя раёны ў трохдзённы тэрмін павінны рапартаваць аб поўным выкананьні плянаў адгрузкі

Ход адгрузкі бульбы Ленінграду

(У ТОНАХ)

19/X—	21/X—	24/X—	28/X—	29/X—
7592	4984	2975	2877	2577

Неадкладна выканаць

Дырэктыва ўраду аб адгрузцы Ленінграду да 1 лістапада 175.000 тон бульбы ня выканана. На 29 кастрычніка адгружана 117.790 тон, што складае 67,3 проц. пляну. За другую палову кастрычніка крутая адгрузкі з кожным днём усё больш і больш зьніжаецца. Калі 19 кастрычніка было адгружана 7.592 тоны, то 21 кастрычніка — 4.984, 24 — 2.975, 26 — 2.877, а 29 кастрычніка ўсяго толькі 2.577 тон.

Асноўная прычына такіх ганебных тэмпаў заключаецца ў тым, што некаторыя партыйныя і асабліва загатоўчыя арганізацыі (Хойнікі, Старыя Дарогі, Рагачоў і інш.) не ўзялі належных бальшавіцкіх тэмпаў, не мабілізавалі шырокіх калгасных мас, спадзяваліся на самацёчнае выкананьне пляну. Тыя-ж раённыя арганізацыі, якія паабольшавіцку ўзяліся за выкананьне плянаў, якія поўнасьцю выкарысталі творчы энтузіязм калгасьнікаў і рабочых саўгасаў (Сенно, Лёзна, Полацак, Плошчаніцы) ня толькі выканалі, але і нават перавыканалі плянавыя заданьні па адгрузцы бульбы.

Заўтра апошні тэрмін. Між тым, Ленінград недаатрымаў 57.000 тон бульбы. Прарыў павінен быць зараз-жа ліквідаваны. Неабходна тэрмінова мабілізаваць усе сілы на поўнае выкананьне пляну. Прыцягваць да адказнасьці апартуністаў, якія патурающь месьніцкім, спажывецкім настроям і гэтым самым зрываюць своячасовае выкананьне плянаў па адгрузцы. Прэміяваць лепшых работнікаў, якія датэрмінова выканалі пляны.

Бяручы прыклад з перадавых раёнаў, калгасаў і саўгасаў, абвясьцілі шырокую барацьбу апартуністычнай стаўцы на самацёк, мабілізаваўшы шырокія колы калгасных мас, план адгрузкі бульбы пралетарам Ленінграду павінен быць неадкладна выканан.

Сустрэчны плян у 250 цэнт.

КОЙДАНАВА, 30. (БелТА). Дзякуючы бальшавіцкім тэмпам работы, вялікаму энтузіязму самых калгасьнікаў, 28 кастрычніка нацыянальныя польскія калгасы «Камунар» і «Кемінтэрн», Рубінкаўскага сельсавету, здалі дзяржаве бульбы 6.500 цэнт., выканаўшы заданьне на 100 проц. 29 кастрычніка на аб'яднаным агульным сходзе гэтых калгасаў, калгасьнікі высунулі сустрэчны плян у 250 цэнт. бульбы і абавязаліся адгрузіць ён на працягу аднаго дня. Выяснена пастанова, каб да 1-га лістапада скончыць усе віды загатовак і плян мабілізацыі сродкаў.

Ганебнае адставаньне

КАПЫЛЬ. (Наш спецкор.). Па Пяслачанскім сельсавеце ўборка бульбы на 26 кастрычніка ў асноўным скончана. З 128 гэкт. па калгасным сэктары ня ўбрана ўсяго толькі два гэктары.

Здавалася-б што пасьпяховае скончэньне ўборкі павінна было значна ўзмацніць тэмпы адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам. Аднак, на 26 кастрычніка плян загатовак бульбы выкананы усяго толькі на 26,1 проц. На цьвёрдых заданьнях спагнана 59,3 проц. Адпаасобнікі выкан

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ КРУТЫ ПЕРАЛОМ У ЗАГАТОЎКАХ—

задача першаступеннай важнасьці для вясковай партарганізацыі

Выкараніць спажывецкія, месьніцкія настроі, якія адлюстроўваюць тактыку кулака, накіраваную на зрыў загатовак

СКАНЦЭНТРАВАЦЬ АГОНЬ ПА КУЛАЦКАЙ АГЕНТУРЫ—ПА АПАРТУНІСТАХ!

Выступленьне т. Шаранговіча

на сходзе Аршанскай партарганізацыі

ВОРША. (Наш кар.). Гэтымі днямі адбыўся агульна-гарадзкі партыйны сход, які абмеркаваў пытаньне аб ходзе загатовак у раёне. **На сходзе выступіў з прамовай сакратар ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧ.**

Тав. Шаранговіч у сваім выступленьні падкрэсьліў, што загатоўкі ў Аршанскім раёне праходзяць досыць марудными тэмпамі.—Зусім правільна, кажа тав. Шаранговіч,—зрабіў раённы камітэт партыі, калі спэцыяльна абмеркаваў пытаньне аб загатоўках і перанёс яго на абмеркаваньне агульнага сходу партыйнай арганізацыі. Пастанова бюро РК дае правільную ацэнку становішчу загатовак ў раёне. Гэты дакумант усклада вялікую адказнасьць на ўсю партыйную арганізацыю на выкананьні плянаў загатовак усіх відаў.

Даючы аналіз становішчу загатовак тав. Шаранговіч паказаў на тыя прычыны, якія перашкаджаюць своячасоваму і пасьпяховаму выкананьню загатоўчых плянаў. Як на асноўную прычыну тав. Шаранговіч паказвае на тое, што рад раённых работнікаў і кіраўнікоў партыйных ячэек замест таго, каб даць рашучы адпор спажывецкім дробна-буржуазным настроям, якія абдываюць кулацкія імкненьні, са мі скаціліся з правільных клясавых пазыцый і ўзялі стаўку на самацёк у загатоўках. Рад кіраўнікоў асобных партарганізацый саўгасаў і калгасаў не зразумелі і ня ўлічылі тых новых абставін, у якіх адбываюцца загатоўкі, не зразумелі таго, што кулак у сваім змаганьні супроць калгаснага руху зьмяніў сваю тактыку і імкнецца ўзарваць калгасы з сярэдзіны. Некаторыя паасобныя партарганізацыі зусім слаба разгарнулі палітыка-масавую работу вакол загатовак. У вясковых арганізацыях ёсьць асобныя члены партыі, якія не адчуваюць адказнасьці за выкананьне, усклаўшае на іх партыйнай абавязкаў. З такімі кадрамі партыйнымі абываталямі, мяшчанамі з партбілетамі трэба весьці самае бязьлітаснае змаганьне.

— Цэнтральны Камітэт КП(б)Б,—гаворыць далей тав. Шаранговіч, — у сваёй пастанове аб ходзе загатовак панёс бязьлітасны ўдар па апартуністычнай практыцы, зьняў з работы цэлы рад кіруючых работнікаў, якія праводзілі апартуністычную практыку і патуралі кулацкім настроям. Гэта пастанова ЦК КП(б)Б павінна мабілізаваць усе партарганізацыі і ячэйкі на неадкладную ліквідацыю прарываў у загатоўках. Задача кожнай партыйнай арганізацыі ўжыць усе меры для таго, каб пляны адгрузкі бульбы для Ленінграду, мясазагатоўкі і збожжазагатоўкі былі выкананы ва ўстаноўленыя тэрміны. Ільназагатоўкі для вашага раёну маюць выключна важнае значэньне. Аршанская партарганізацыя ня дрэнна справілася з расьцілкай і мочкай ільну. Яна павінна заразмяркаваць усе сілы і сродкі на першапачатковую апрацоўку ільну, на здачу ільнавалакна загатоўчым арганізацыям.

Спыняючыся на задачах калгаснага будаўніцтва, тав. Шаранговіч сказаў:

— Цэнтральная і вузлавой задачай калгаснага будаўніцтва зьяўляецца арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў на аснове ўвядзеньня зьдзельнічыны, паладжаньня дасканалага вучоту працы, разьмеркаваньня ўраджаю па прыцыпах колькасьці і якасьці затрачанай працы. Ад практычнага выкананьня гэтай задачы залежаць далейшыя посьпехі ў калгасным будаўніцтве. Трэба весьці самае жорсткае змаганьне з усякай недаацэнкай арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў, з пагоняй за голымі лічбамі. Арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў магчыма праводзіць толькі на аснове бязьлітаснага змаганьня на два фронты, толькі павышаючы пільнасьць партыйных арганізацый. У некаторых раёнах за апошні час выкрыты моманты, калі паасобныя кіраўнікі партыйчэек у рэзультаце прытуленьня клясавай пільнасьці апынуліся ў палоне кулацкіх элемэнтаў. Трэба бязьлітасна выкрываць кулака, які імкнецца разбурыць калгасы з сярэдзіны, зрываючы арганізацыю працы, правільнае разьмеркаваньне ўраджаю, падрываючы правядзеньне асноўных гаспадарча-палітычных кампаній.

— Задача партыйных ячэек на вёсцы павысіць авангардную ролю камуністаў, канкрэтызаваць кіраўніцтва партыйных ячэек вытворчым жыцьцём калгасаў і саўгасаў.

Я ўпэўнен,—канчае тав. Шаранговіч,—што аршанская партарганізацыя да надыходзячага пленуму ЦК КП(б)Б дасягне новых посьпехаў у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у правядзеньні асноўных гаспадарча-палітычных кампаній. Я ўпэўнен, што наша арганізацыя з бальшавіцкай настойлівасьцю, вядучы бязьлітаснае змаганьне супроць ворага і «левага» апартунізму выканае тыя задачы, якія ўскладзены на яе партыяй.

**

Агульна-гарадзкі партсход у адналосна прыняў пастанову абвясьціў сябе мабілізаваным на штурм прарываў у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній. Партарганізацыя абавязалася да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі выканаць ня менш як на 75 проц. гадавы плян збожжазагатовак.



Прамыўка паравозу ў дэпо Масква

Баявую праграму—правесьці ў жыцьцё

МЕНСКІ ГАРКОМ КП(б)Б І ГарКК падагулілі папярэднія вынікі ходу выкананьня ў раёне плянаў загатовак. Апублікаваная ўчора пастанова бюро гаркому і прэзыдыуму ГарКК на гэтым пытаньні дае глыбокі палітычны аналіз прычын недапушчальнага адставаньня ў выкананьні плянаў загатовак збожжа, бульбы і мяса, шырока выкрывае факты правапартуністычных адносін раду парт'ячэек, сельсаветаў, калгасаў і раённых загатоўчых арганізацый да выкананьня гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы.

На раёне, дзе завершана ў асноўным калектывізацыя, дзе вялікую ўдзельную вагу ў загатоўках займае сацыялістычны сэктар, што спварае спрыяючыя ўмовы для пасьпяховага выкананьня плянаў ва ўстаноўленыя тэрміны, загатоўкі праходзяць марудна. Квартальны плян па збожжазагатоўках выкананы толькі на 27,8 проц., па бульбе—на 45 проц. і па мясе—на 9,4 проц. Тут горш за ўсё тое, што калгасы і саўгасы раёну адстаюць у выкананьні плянавых заданьняў.

У чым-жа прычыны такога недапушчальнага становішча?

На гэта пытаньне даецца выразны адказ у пастанове бюро гаркому і прэзыдыуму ГарКК.

У пастанове гаворыцца:

«Замест бальшавіцкага змаганьня за выкананьне плянаў загатовак, якое павінны весьці ўсе камуністы, і ў першую чаргу кіраўнікі саўгасаў і калгасаў, меліся выпадкі, калі асобныя партыйцы, стаўшы на шлях разважаньняў аб нерэальнасьці і немагчымасьці выкананьня даных плянаў па збожжы і бульбе, падпалі пад уплыў кулацкіх настрояў і скаціліся да простага сабатажу ў выкананьні плянаў загатовак, падмянілі агульна-дзяржаўныя інтарэсы—інтарэсамі месьніцкімі, спажывецкімі».

Раённыя загатоўчыя арганізацыі (райспажыўсаюз, райсадзкантора), райкалгасаюз, МТС, паасобныя парт'ячэйкі, сельсаветы, кіраўнікі саўгасаў і калгасаў не разгарнулі належнай работы вакол загатовак, каб забясьпечыць выкананьне ўсім рэальных плянаў, не мабілізавалі масы на барацьбу супроць кулацкіх настрояў у калгасах, супроць рвацкіх спажывецкіх тэндэнцый пры складаньні збожжа-фуражных баляансаў, і гэта ў той час, калі імкненьні захаваць сапраўдныя паказальнікі ўраджаю, перапавялічваць збожжа-фуражныя балянсы, яўна варожыя, рэакцыя тэндэнцый мелі досыць шырокае распаўсюджваньне.

Асабліва выдзяляюцца ўвагі дзейнасьцю ў справе арганізацыі загатовак кіраўніцтва **Строчыцкай, Сяньненскай, Каподзішчанскай, Замастоцкай і Абчацкай** парт'ячэек. На сходах гэтых ячэек прымаліся ня менскія пастановы аб анатэмы 1 арганізацыі загатовак, аб націску на кулацка-заможныя гаспадаркі, але-ж у жыцьцё гэтыя пастановы не праводзіліся. Ход загатовак прадастаўлен быў самацёку, ня ўжываліся ніякія захады для спагнаньня збожжа, бульбы і мяса па цьвёрдых заданьнях. Кіраўніцтва **Строчыцкай парт'ячэйкі** літаральна страціла плісавую пільнасьць, не мабілізавала масы на барацьбу супроць кулацкай дзейнасьці, накіраваў на зрыў загатовак. Яўныя кулацкія прыхільнікі з партбілетамі, як **Барысевіч** і інш., ня сустракалі з боку ячэйкі ніякага адпору.

Паасобныя «камуністы», знаходзячыся на чале калгасаў, ня толькі не змаглі за выкананьне плянаў загатовак, не вялі ніякай барацьбы з рвацкімі тэндэнцыямі ў калгасах, а самі ўзначальвалі варожыя настроі. Махровы апартуніст Нечай праводзіў у калгасе імя Будзённага кулацкі прынцып пры разьмеркаваньні ўраджаю. Старшыня праўлення калгасу «Адраджэньне» **Батура** сабатаваў выкананьне загатовак сваёй праапартуністычнымі разважаньнямі аб «нерэальнасьці» пляну. Гора-кіраўнік калгасаў **Муца** («Чырвоны спэцыяліст») і **Шкабара** («Прабуджаная праца») таксама апынуўшыся пад уплывам кулака, сабатавалі выкананьне плянаў загатовак. **Коза-Дворацкая** парт'ячэйка нават падтрымлівала яўнага кулака Дэмбіцкага, які быў старшынёй праўленьня калгасу імя 1-ай Конніцкай. Кіраўніцтва ячэйкі «заклікала да парадку» тых, хто спрабаваў выкрываць гэтага кулака, прапанавала стаўрыць яму аўтарытэт і настойвала перад гаркомам на прыёме гэтага кулака ў партыю.

Падзенні факты настойліва вымагаюць ад кожнай парт'ячэйкі павялічэньня клясавай пільнасьці і ўзмацненьня барацьбы з кулацкай агентурай у радах партыі—правымі апартуністамі.

На лепш стаіць справа з выкананьнем плянаў загатовак і па многіх саўгасах раёну. Такія саўгасы, як **«Заціішша»** і **«Прылукі»** яшчэ да гэтага часу не здалі дзяржаве ні кілёграма збожжа. Тут таксама месьніцкія, спажывецкія інтарэсы прытапчаны агульнадзяржаўным інтарэсам.

Бюро гаркому і прэзыдыум ГарКК рашуча ўдарылі па посьбітах праваапартуністычнай практыкі, якія паставілі плян загатовак пад пагрозу недавыкананьня. Бюро гаркому і прэзыдыум ГарКК распусьцілі бюро Строчыцкай парт'ячэйкі, сакратару гэтай ячэйкі і старшыні сельсавету абвесьцілі суровае вымова з папярэджаньнем. Апартуністы **Барысевіч, Нечай, Шкабара** выключаны з партыі. Старшыням праўленьняў калгасаў—**Батура, Раманоўскаму, Муца** і сакратару Сяньненскай парт'ячэйкі **Качынскаму** абвешчаны вымовы. Абвешчана вымова і ўсяму складу Нова-Дворокай парт'ячэйкі.

За зрыў плянаў па здачы гародніны абвешчана суровая вымова дырэктару саўгасу **«Прылукі» Жывіцкаму** і зьняты з работы дырэктар саўгасу **«Заціішша» Мяшкоў.** Таксама зьняты з работы і дадзе суровае партпатчаньне старшыні Грычанскага і Альшыцкага сельспажыўтаварыстваў. Пастаўлена пытаньне перад ЦК КП(б)Б аб зьняцьці з работы дырэктара сельгасаб'яднаньня Белкаапсаюзу Вайцэхоўскага і старшыні ВРК СЗС Вашкевіча, якія сваімі распараджэньнямі аб бравіяваньні фондаў і порк труба сталі партпінію ў справе забясьпячэньня рабочых гораду бульбай і гародніной.

Разам з гэтым у пастанове выразна вызначаны задачы парт'ячэек сельсаветаў, калгасаў і загатоўчых органаў у поўнае ліквідацыі адставаньня па загатоўках. **Гэта пастанова зьяўляецца баявой праграмай работы вясковых парт'ячэек Менскай арганізацыі. Рэалізацыя гэтай пастановы, выкананьне апартуністычнай практыкі забясьпечвае ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне плянаў загатовак. Парт'ячэйкі павінны неадкладна мабілізавацца на гэты адказнейшы ўчастак работы.**

Я.

Да адказнасьці зрыўшчыкаў загатовак!

Плян загатовок па **Калпыньскім раёне** на 25 кастрычніка выкананы толькі на 31,8 проц. Прычына такога адставаньня заключаецца ў тым, што цэлы рад партыйных ячэек ня здолеў па-бальшавіцку арганізаваць загатоўкі, мабілізаваць актыўнасьць калгаснікаў на выкананьне плянавых заданьняў. Асобныя кіраўнікі партыйных ячэек, некаторыя кіраўнікі саўгасаў і старшыні сельсаветаў замест таго, каб даць бязьлітасны адпор спажывецкім, рвацкім настроям і імкненьням кулацтва сарвалі загатоўкі—самі скаціліся ў балота апартунізму і фактычна дапамагалі кулаку.

Асабліва адстаюць у загатоўках **Посечанскі, Вялікараеўскі і Пацэйкаўскі сельсаветы.** На гэтых сельсаветах выкананьне пляну загатовак не перавышае 15 проц. Паўтары месяцы назад раённай газэтай **«Калгасьнік Капыльшчыны»** яны былі занесены на чорную дошку.

Песачанская, Вялікараеўская і Пацэйкаўская ячэйкі КП(б)Б ня ўжылі рашучых мер для пасьпяховага выкананьня плянаў загатовак, не разгарнулі работы для таго, каб зьняць сельсаветы з чорнай дошкі.

Сакратар Вялікараеўскай ячэйкі КП(б)Б на працягу ўсяго перыяду правядзеньня загатовак ашукваў партыйную арганізацыю. На пленуме сельсавету, пасьля таго, як сельсавет быў занесен на чорную дошку, была вынесена пастанова аб тым, што плян загатовак будзе выкананы да 25 кастрычніка. Але гэта пастанова засталася толькі дэкларацыяй. На пленуме сельсавету **сакратар ячэйкі Мікалаеня** сваім выступленьнем ня толькі не мабілізаваў мас на выкананьне плянаў загатовак, а, наадварот, выступіў з прапановай **зьнізіць цьвёрдыя** заданьні кулацка-заможным гаспадаркам. Да рочы, цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнымі гаспадаркамі адносна собствэнцыі. На настаўленьні брыгады газэты «Калгасьнік Капыльшчыны» гэта яна кулацкая прапанова сакратара ячэйкі была ахоплена. Тады Мікалаеня выступаў і пачаў даказваць нерэальнасьць пляну. Выступленьні Мікалаеня актыўна падтрымліваў старшыня сельсавету Рэчын.

Вышэйапісаны факт выразна паказвае, што Мікалаеня скаціўся на пазыцыі кулацтва і адыгрываў ролю не кіраўніка партыйнай ячэйкі, а двурушніка, кулацкага агента.

Ня здолела арганізаваць загатовак і **Песачанская парт'ячэйка.** Яна ня ўдарыла па дробна-буржуазных спажывецкіх настроях, якія зыходзяць, пад уплывам кулацкай агітацыі, ад адсталых груп калгаснікаў і нават асобных кіраўнікоў калгасаў. Старшыня **калгасу «Бальшавік»—член партыі Пліт** літаральна вытнаў з калгасу брыгаду «Калгасьніка Капыльшчыны». Ён заявіў: «Ніводнага кілё збожжа ня даў і ня дам; у мяне сьвінагадоўчая гаспадарка, раней забясьпечу сябе, а тады будзем думаць аб здачы дзяржаве». Старшыня Песачанскага сельсавету—член партыі **Кот** выступае і даводзіць нерэальнасьць пляну.

Газэта «Калгасьнік Капыльшчыны» правяла ініцыятыву ў арганізацыі работы па выкананьні загатоўчых плянаў. Некалькі часу назад газэта склікала нараду ў Старыцкім сельсавеце, які ідзе наперадзе па выкананьні плянаў загатовак, і арганізавала буксірныя брыгады з перадавых калгаснікаў для дапамогі ў арганізацыі загатовак калгасам тых сельсаветаў, якія адстаюць. Апартуністы і кулацкія агенты ўсямерна імкнуліся сарваць работу брыгад друку.

І гэта не дзівіцьмася. Гэтыя факты [illegible] некаторыя раённыя установы. Што гэта іменна так, гаворыць наступны факт. Гэтымі днямі рэдакцыя газэты «Калгасьнік Капыльшчыны» разам з прадпрыемствам паслала брыгаду у райкалгасаюз з мэтай выкананьня кіраўніцтва загатоўкамі і рэалізацыі пляну разгортваньня [illegible] загатоўкі. Старшыня райкалгасаюзу **Шэмбель** брыгаду выгнаў.

Характэрна, што калі пытаньне аб гэтых усіх фактах было даведзена да бюро райкому партыі, дык ні адзін з членаў бюро ня даў адпору апартуністам, якія імкнуліся сарваць і зрывалі работу брыгад друку на збожжазагатоўках. Наадварот, на бюро райкому 26 кастрычніка намесьнік старшыні райкалгасаюзу **Загорскі** ўзяў пад абарону апартуніста Пліта. Ён заявіў:

— Гналі і гнаць будзем гэтых пісак, якія перашкоджаюць нам весьці работу. Тое-ж самае заявіў і старшыня райкалгасаюзу Шэмбель.

— Прагнаў раз,—кажа ён,—прыдзеце яшчэ—праганю зноў.

Твар апартуніста Шэмбеля стане ясным, калі дадаць тое, што райкалгасаюз даў некалькі часу таму назад дырэктару калгасам аб тым, каб яны ў першую чаргу забясьпечылі свае ўнутраныя патрэбы і толькі ў другую чаргу здавалі збожжа дзяржаве.

Калпыньская партарганізацыя павінна нэнесьці бязьлітасны ўдар па кулацкіх агентах, прыцягнуць да суровай адказнасьці апартуністаў і глушыцеляў самакрытыкі, якія зрываюць работу па загатоўках.

Э—скі.

Выклік можа застацца на паперы

[illegible] работы [illegible] справаздачна перавыбарчай кампаніі заўкому не праводзілася. Заўком гэтага пытаньня не [illegible] пасяджэньнях і сходах не абгаворваў. Гра[illegible] зусім не мабілізавана. Адозва ЎсеЦСПС аб перавыбарах **не прапрацавана.** У заводскім клюбе няма ніводнага лёзунгу і плякату, які быў-б прысьвечаны перавыбарчай кампаніі. Насьценная газэта ня толькі не асьвятляла пытаньняў ходу падрыхтоўкі да перавыбараў, але нават у апошні час зусім спыніла выхад.

Праверкі становішча работы заўкому не праводзілася, ня гледзячы на тое, што [illegible] заўкому [illegible] рабочых па пытаньні перавыбараў заўкому. На сходах рабочыя падавалі рад фактаў бязьдзейнасьці работнікаў заўкому ў справе падрыхтоўкі да перавыбараў.

Заўком цагельні № 1 выклікаў на сацспаборніцтва заўком № 11 першай і трэцяй цагельні Менбуду на лепшае правядзеньне справаздачна - перавыбарчай кампаніі. Пры такіх тэмпах выклік можа застацца на паперы. На сходзе 11 рабочых-ударнікаў добраахвотна запісаліся ў брыгаду для праверкі работы заўкому.

ДОРСКІ.

Камунар" адкрывае тэхнікум на 350 чал.

Рабочы калектыў заводу «Камунар» сьвячасова пачаў падрыхтоўку да перавыбарчай кампаніі заўкому. Ва ўсіх цэхах былі праведзены гутаркі, а таксама прапрацавана адозва ЎсеЦСПС аб перавыбарах. Зараз праводзіцца праверка ўсёй работы заўкому, для чаго створана 40 самаправерачных брыгад.

Перавыбарчая кампанія заўкому арабіла значны пералом у бок выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

За апошні час значна павялічыўся прыток рабочых рацыяналізатарскіх прапаноў. Шмат новых рабочых ахоплены ўдарніцтвам і сацспаборніцтвам. Ва ўсёй сыстэме работы ўводзіцца прэміяльна-прагрэсыўная зьдзельшчына. Пераведзена на гаспадарчы разрахунак брыгада бэтонных варштатаў.

Да перавыбараў заўкому прыстасавана адкрыцьцё новай сталоўкі і клюбу, а таксама адкрываецца тэхнікум на 350 чалавек і камсамольскі інтэрнат на 45 асоб.

Хаімоўскі.

Узорна правесьці перавыбары ФЗМК

На 10 дзён раней

ВЫКАНАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН—

абяцаюць ударнікі „Бальшавіка“

РАЎНЯЦЦА ПА ПЕРАДАВЫХ!

Перавыбарчая кампанія нізавых прафарганізацый па большасьці прадпрыемстваў г. Менску за апошнія дні значна разгарнулася. Рад ФЗМК па-баявому ўключыўся ў рэалізацыю адозвы ЎсеЦСПС. Распрацаваны апэрацыйныя пляны перавыбараў, вызначаны канкрэтныя абавязацельствы па рэалізацыі прамовы ТАВ. СТАЛІНА і адозвы ЎсеЦСПС, арганізаваны самаправерачныя брыгады, уключыўся ў перавыбары заводзкі друк і г. д. Да такіх прадпрыемстваў трэба аднесьці заводы «БАЛЬШАВІК», «КАМУНАР», ІМЯ БАРАШЫЛАВА і інш.

Некаторыя вынікі па гэтых прадпрыемстваў характарызуюцца наступнымі фактамі.

Па заводзе «КАМУНАР» складзена 40 брыгад з 247 удзельнікамі-добраахвотнікамі, паступіла 28 рабочых прапаноў, пераходзяць на гаспадарчы разрахунак 10 брыгад, з якіх адна перайшла ўжо. Праведзен зьлёт ІТР.

Па заводзе «БАЛЬШАВІК», у сувязі з перавыбарамі, пастаўлены баявыя задачы ДА ТЭРМІНУ (НА 10 ДЗЁН РАНЕЙ) ВЫКАНАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН ПА ЎСІХ ПАКАЗАЛЬНІКАХ, разгарнуць **растлумачальную работу за гаспадарчы разрахунак брыгады, (12 брыгад падалі ўжо заявы). Завербавана звыш 160 чал. добраахвотнікаў для праверкі прафработы, завод уключыўся ў конкурс на лепшае правядзеньне перавыбараў і абвясьціў унутрызаводзкі конкурс, устанавіўшы прэміі за лепшае правядзеньне перавыбараў у цэху—200 руб., за лепшую работу самаправерачнай брыгады—100 руб.**

Па друкарні ІМЯ СТАЛІНА быў праведзен зьлёт ударнікаў. Прадпрыемства ўключылася ў правядзеньне сталінскай эстафэты. Друкуецца адозва ЎсеЦСПС з мэтай распаўсюджваньня яе сярод усіх рабочых. Заўком уключыўся ў конкурс на лепшае правядзеньне перавыбараў.

Па фабрыцы імя КРУПСКАЙ прапрацавана адозва ЎсеЦСПС і, у адпаведнасьці з гэтым, распрацован канкрэтны плян перавыбараў. ЗА ГЭТЫ ЧАС 85 РАБОТНІЦ ПРЫНЯТЫ Ў САЮЗ, 175 РАБОЧЫХ, У ТЫМ ЛІКУ ЗНАЧНАЯ ЧАСТКА НОВЫХ, АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ, пачалі паступаць заявы аб прыёме ў партыю, паступаюць рацыяналізатарскія прапановы.

Па фабрыцы «КАСТРЫЧНІК» — ужо звыш 100 чал. [illegible] ў самаправерачныя брыгады, ПРАВЕДЗЕНА НАРАДА РАБКОРАЎ. Абвешчан унутрызаводзкі конкурс.

Па «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКУ»—таксама абвешчан унутрызаводзкі конкурс, на які выдзелена 400 руб. Заўком уключыўся ў правядзеньне сталінскай эстафэты; за апошнія 10 дзён паступіла 48 РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ.

Па заводзе «ЧЫРВОНАЯ ЗАРА» — звыш 30 проц. рабочых уцягнута ў самаправерачныя брыгады, праведзен зьлёт ударнікаў. 6 РАБОЧЫХ З ВЫТВОРЧЫМ СТАЖАМ АД 10 ДА 35 ГОД ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ ПРЫЁМЕ Ў ПАРТЫЮ.

Па паказаных прадпрыемствах пытаньне аб перавыбарах прапрацавана як партыйнымі, так і камсамольскімі калектывамі і ячэйкамі.

Адначасова ёсьць такія ФЗМК і рабочкомы, якія толькі яшчэ «думаюць» пачаць справаздачна-перавыбарчую кампанію. Да іх адносіцца фабрык кушкерный фабрыкі імя 1 мая, шпаперный фабрыкі, рабочком пабудовы Дому Ураду, які чакае дырэктыў ЦП, і інш. Партыйныя і камсамольскія ячэйкі па гэтых прадпрыемствах не мабілізавалі ў належнай меры камуністаў і камсамольцаў на перавыбары ФЗМК.

Трэба папярэдзіць асобныя моманты скажэньня прынцыпу добраахвотнасьці па праверцы працы, як гэта мела месца НА ГУЦЕ «ПРАЛЕТАРЫ», дзе ў сувязі з «нежаданьнем», паводле заявы старшыні заўкому, удзельнічаць у самаправерцы, ВЫЛУЧЫЛІ ПРАЗ АГУЛЬНЫЯ СХОДЫ «ДОБРААХВОТНІКАЎ» У АБАВЯЗКОВЫМ ПАРАДКУ (!?) Таксама трэба даць рашучы адпор асобным імкненьням, як можна хутчэй, «скоропалительно» скончыць перавыбары, гэтым змазваючы падрыхтоўку і наогул палітычную сутнасьць перавыбараў, якія патрабуюць ШЫРОКАГА МАСАВАГА І АКТЫЎНАГА ЎДЗЕЛУ ЎСІХ РАБОЧЫХ. Трэба адзначыць, што пакуль слаба ажыцьцяўляецца МЭТАД САЦСПАБОРНІЦТВА паміж прадпрыемствамі, слаба ўключаюцца ў перавыбары ФЗМК і сваіх бюро сэкцый ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫЯ РАБОТНІКІ.

Прадпрыемствы Менску павінны яшчэ шырэй разгарнуць працу. Адстаючым бездакладна падцягнуцься, рэгулюючыся па перадавых. Перавыбары павінны прайсьці па-баявому.

УЛАД. КУДРАЕЎ.

А. СТАЛЕВІЧ

ПОЛЬСКІ ФАШЫЗМ НА ВУЛЬКАНЕ

У адным з сваіх апошніх нумароў газэта «Кур'ер Віленскі» пісала:

«Як 11 год таму назад (у часе наступленьня Чырвонай арміі), так і цяпер стаім на небясьпечным бастыёне, а зямля гарыць пад нагамі. Надыходзячая зіма будзе ня толькі пераломнай, з пункту гледжаньня між народнай палітыкі, але і ўнутры краю. Гэтую бітву, якую вядзем што дня праз доўгія месяцы мы павінны выйграць».

Гэткую ацэнку сытуацыі ў Польшчы дае орган пілсудчыкаў. Гэтае адкрытае прызнаньне фашысцкіх верхаводаў вы яўляе іх няўпэўненасьць у свае сілы з мэтай паправіць свае недахопы, але зьяўляецца выразам панікі перад шалы ходзячай катастрофай, гэта ёсьць выяўленьне поўнай роспачы і жудасьці на ныючай клясы перад узрастаючай рэвалюцыяй, перад сьвядомасьцю нямінучай сваёй пагібелі.

«Беларуская крыніца» — газэта бела рускай хадэцыі ў кастрычніцкім нумары, разважаючы са свайго ксяндзоўскага катуха аб крызісе капіталізму ад значае:

«Можна сказаць з поўнай упэўненасьцю, што людзі перажываюць крызіс дзвер'я да сёньняшняга палітычнага, грамадзкага і фінансавага парадку».

І далей з роспачы газэта дадае, што:

«Горшыя рэчы яшчэ перад намі. Крызіс капіталізму, які пачаўся пару год таму назад, цяпер даходзіць да найвышэйшай ступені».

Паглыбленьне прамысловага, аграрнага і дасьпеваньне фінансавага крызісу, а ў зьвязку з тым і загастрэньне рэвалюцыйнай барацьбы бязумоўна ставіць фашысцкую Польшчу перад «пералом ным» моментам, як асьцярожна выражаецца «Кур'ер Віленскі».

Сусьветны крызіс капіталізму ўсьцяж паглыбляецца і завастраецца. Фінансавы крах у Англіі цягне ў бездань, пры чым з нарастаючай шпаркасьцю. Больш слабыя зьвяньні сусьветнага капіталізму, у тым ліку і Польшчу, у якой больш як дзе-небудзь перабольшаны ка пітальстычныя супярэчнасьці як унутра нога, так і міжароднага парадку. Тое, што гаспадарчы крызіс, крызіс капіталістычнай сыстэмы ў Польшчы ідзе па вызначаватай уніспадаючай лініі, стала неабвержнай ісьцінай. Аб гэтым пасту паюць штодзенна пераканаўчыя весткі.

Урад, каб залатаць прарывы ў сваім бюджэце вайны, голаду і беспрацоўя, вышуквае самыя рознавідныя сродкі но вага ўзмноженага наступленьня на працоўныя масы, новага выпампоўваньня апошніх сродкаў і сіл з рабочых і сялян. Аб гэтых мерапрыемствах, якія можна назваць **галоднымі дэкрэтамі,** урад і яго актыўныя паслугачы сацыял-і нацыянал-фашысты падымаюць шум—гам як аб сродках, якія быццам выля чаць балячкі прагнілушага капіталістычнага ладу Польшчы.

За апошні час урад, а таксама і сойм на асенняй сэсіі прыняў да 120 закономераткаў — галодных дэкрэтаў, маючы на мэце ўвесь цяжар крызісу і выдаткаў на падрыхтоўку вайны супроць СССР усклаўшы на плечы працоўных мас. Вось галоўнейшыя з гэтых дэкрэтаў, якія даюць павышэньне падаходнага падатку на зарплату, павышэньне на сажырскага, паштовага і тэлефоннага тэ рыфаў, новы падатак на піва, віно, за палкі, газу і інш. Павялічана ападатка ваньне рамесьніцкіх пасьведчаньняў, га странамічных установаў, дэктароў, артыс таў і т. п. Выпрацоўваюцца ўсё новыя і новыя галодныя дэкрэты. Выпрацавана новая форма эксплёатацыі, нябывалая па сваёй нахабнасьці. Будуць сыстэматычна абвяшчацца некалькі дзён у месяц так званыя «дні працы», зарплату за якія рабочыя і служачыя «аддаюць на карысьць беспрацоўных».

Апрача таго, рабочыя і служачыя робяць абавязковыя аддлічэньні ад пала віны да 6 процантаў зарплаты і таксама ў фонд розных філянтрапічных камітэтаў для беспрацоўных, у склад якіх уваходзяць банкіры і выдатныя капіталісты, як, напрыклад, былы міністар фінансаў Клярнэр. Галінскі і інш. Ліс тоўка ЦК КПЗБ так характарызуе гэтыя «дні працы»:

«Урад абвяшчае 15 сьнежня днём працы, г. зн., што ўсе рабочыя, бат ракі і служачыя павінны свой зарабатак гэтага дня аддаць у рукі розных панскіх камітэтаў, так званай дапамогі беспрацоўным. Гэта значыць што фабрыканты і абшарнікі, пры крываючыся дапамогай беспрацоўным, хочуць заработкі ўсіх тых, хто будзе працаваць у дзень 15-га сьнежня забраць для сваіх эксплёататарскіх мэт. Гэта значыць, што дзень 15-га сьнежня зьяўляецца днём грабяжу апошніх грошаў працоўных мас, днём шуканствуў і зьдзекаў».

Адбіраючы апошні кавалак ад тых, што яшчэ зарабляюць жабрачы грош, капіталісты, зразумела, робяць гэта ня з мэтай дапамагчы беспрацоўным і галадаючым, як яны шумна абвяшчаюць аб гэтым, але каб самім спокульнуць на галечы працоўных мас, каб унесьці раз набой і нязгоду ў паасобныя атрады працоўных мас.

Рост шалёнай дарагоўлі няшчадна б'е і руйнуе ўшчэнт асноўныя сялянскія масы. Ножніцы паміж прамысловымі і сельска-гаспадарчымі таварамі ўсьцяж растуць. Калі да вайны, як паведамляе афіцыяльная польская статыстыка, се лянін за плут плаціў 135 клгр. жыта, дык цяпер плаціць 321 клгр.; за 10 клгр. цукру плаціў 46 клгр. жыта, цяпер плаціць 117; за 100 клгр. солі плаціў 6 клгр. жыта, цяпер — 26; за боты — 75 кгр., а цяпер—321.

Апошнія ўрадавыя ўставы даюць права мясцовым уладам спаганяць падаткі натурэй, што разьвязвае рукі мясцовым верхаводам драць-драць для ўраду і для сабе па казённых цэнах, інакш кажучы за бесцань усё што пападзецца ім на вока. Падатковы прэс усё мацней зацісае ўжо ня толькі рабочых і сялян, але і шырокія колы гарадзкога дробнага мяшчанства, як рамесьнікі, служачыя, дробныя гандляры.

Шукаючы капіталістычнага выхаду з крызісу фашысцкая дыктатура аднача сова крута завярнула на завастрэньне белага тэрору, накіраванага больш чым калі-небудзь на расправу над шырокімі масамі. Карныя экспэдыцыі ўжо сталі пастаянным зьявішчам у Польшчы і не раважна на ЗБ і ЗУ. У Глыбокім, Львове, Лодзі, Вільні, у выніку работы над звычайных (дараэных) судоў, ужо было павешана па некалькі чалавек-рэвалюцыянэраў. Цяпер кару сьмерці можа атрымаць любы рабочы, які змагаецца за сваё існаваньне, супроць гвалту капіталу, беспрацоўны, які дамагаецца хлеба і працы, селянін, які адбіваецца ад грабяжу яго рэштак ад кулацкай камасацыі, фэадальных формаў кабалы. Надзвычайныя суды сьведчаць аб аслабленьні і нязгодзе заўтрашняга дня перад фашысцкай дыктатурай.

«Баронячыся ад надыходзячай рэвалюцыі польскі фашысцкі ўрад увёў надзвычайныя суды, каб расправіцца з рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі, каб вырваць з нашых радоў самых адважных змагароў. Польскі фашысцкі ўрад увёў надзвычайныя суды з мэтай расправіцца над рэвалюцыйным рухам, з мэтай больш пасьпяховай падрыхтоўкі нападу на СССР».

Так кажа адозва ЦК КПЗБ, выданая на поваду апошніх расправ надзвычайных судоў над рабочымі і сялянамі Зах. Беларусі.

«Трэба рашуча нішчыць усялякія выступленьні як вулічных антыдзяржаўных банд, так і камуністаў чых інтэлігентаў, якія атручваюць грамадзкую атмасфэру. Урад і грамадзянства павінны спаткаць надыходзячую зіму прыгатаванымі на ўсялякія магчымасьці».

Такія дырэктывы дае фашысцкаму лягеру ўраловы орган Пісудзкага — «Газэта Польска». Фашызм разьлічвае на тое, што душачы павольнай сьмерцю рэвалюцыйны авангард па вастрогах увядзеньнем новага жорсткага рэжыму, што расстрэльваючы і вешаючы паасобных камуністаў, яму ўдасца адгразадзіць кам партыю ад мас, пазбавіць іх кіраўніка і гэтым затармазіць, распарушыць рэвалюцыйны рух.

Ці ўдасца гэта фашысцкім катам. Не. Аб гэтым сьведчыць узрастаючая хваля

У выніку апартуністычнай бязьдзейнасьці

рад устаноў і прадпрыемстваў пазбаўлены крэдытаў

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны выявіць вінаватых у зрыве пераходу на новы парадак крэдытаваньня

На гледзячы на выразнае папярэджаньне пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, рад гаспадарчых органаў ня толькі не падрыхтаваўся да новага парадку крэдытаваньня, але нават на забясьпечыў прадстаўленьня ў Дзяржбанк вестак аб фактычным становішчы сум у дарозе, якія (весткі) неабходны для разьмеркаваньня запазычанасьці гэтых органаў банку, прыстасоўна да новых форм крэдытаваньня.

Да гэтага часу гаспадарчыя органы не атрымалі ўласных зваротных сродкаў, чым таксама ўскладняецца пераход да новых мэтадаў работы.

Амаль ніводная арганізацыя не прадставіла ў банк дагавароў з пакупцамі, што ставіць пад пагрозу бесперабойнае крэдытаваньне адпаведных прадпрыемстваў і арганізацый, пачынаючы з 1-га лістапада.

У выніку—Белкантора Дзяржбанку зрымушана была 29 кастрычніка зачыніць крэдыты Белантэканіраўніцтву, канторы «Союзкож», раду аб'яднаньняў Белкавасаюзу (сілізатна-мэталёвая, гаспадарчых тавараў, культтавараў, забесьпячэньня дзіцей і г. д.), Мэталялому і інш.

Грамадзкія арганізацыі гэтых гаспадарчых органаў павінны праверыць хто пэрсанальна вінават у тым, што яны пазбаўлены крэдыту, хто пэрсанальна вінават у тым, што не забясьпечана прадстаўленьне неабходных матар'ялаў банку.

На лепш стаіць справа і з менскімі гарадзкімі гаспадарчымі органамі, якія абслугоўваюцца Менскім аддзяленьнем Дзяржбанку.

Аддзяленьнем спынена выдача палуўных грошай заводу імя Варашылава, швэйнай фабрыцы «Кастрычнік», кандытэрскай фабрыцы «Камунарка», шчотачнай фабрыцы, швэйнай фабрыцы імя Крупскай і амаль што ўсім арганізацыям спажыўсыстэмы.

Кіраўнікі пералічаных прадпрыемстваў і арганізацый павінны даць рабочай грамадзкасьці праз друк свой адказ аб прычынах зрыву важнейшага палітычнага і гаспадарчага мерапрыемства, якім зьяўляецца пераход да новых форм крэдытаваньня.

БЕЛСАМПРАМСАЮЗ „ПАДРЫХТАВАУСЯ"

Падрыхтоўка Белсампрамсаюзу да новых форм крэдытаваньня заключаецца толькі ў тым, што Усесаюзсампрамсавет на гэтым нытаньні была склікана нарада ў Маскве і што прадстаўнік Белсампрамсаюзу прымаў у ёй удзел.

Адным «з вялікіх дасягненьняў» Белсампрамсаюзу ў справе наладжаньня сп. звадачнасьці зьяўляецца складзены на 1-га студзеня 1931 г. зводны баланс. Гэты зводны баланс настолькі ўзьняў настрой работнікаў Белсампрамсаюзу, што яны пастанавілі — абвясьціць вызову тым райсампрамсаюзам, якія не прадставілі балянсу на 1-га студзеня. Далей яны абяцалі Белканторы Дзяржбанку самым катэгарычным чынам патрабаваць ад саюзаў справаздачнасьці на 1/VIII і на 1/X: «Мы нават паведамім ім (саюзам), што непрадстаўленьне справаздачнасьці на 1/VII (!) пазбавіць іх права" апрацэтаваць вызначаныя ім ліміты».

А пакуль што па сыстэмо сампрамсаюзу адсутнічае зводная справаздачнасьць за 9 месяцаў.

Работнікі Белсампрамсаюзу настроены самакрытычна. Яны нават прызналіся: «У якой ступені дагавары, заключаныя на IV квартал, здавальняюць пляновыя намічэньні, мы ня ведаем». Адсюль можна зрабіць адзін вывад: сыстэма Белсампрамкаапэрацыі зусім не падрыхтавалася да новых форм крэдытаваньня.

М. К—н.

З балянсамі на 1 студзеня

Да 1 лістапада — пачатку новага парадку крэдытаваньня — гаспадарнікі Бабруйску ня рыхтуюцца. Зваротныя сродкі па прадпрыемствах выдучаны толькі на лініі Белмяса і Прамтрэсту. Але апошні і не прыступіў яшчэ да разьмеркаваньня гэтых сродкаў па прадпрыемствах.

Леспрамгас, камбінат, райспажыўсаюз маюць балянсы толькі на становішчы на 1 студзеня 1931 году. «Эльвод» ня мае справаздачных балянсаў з мая месяца.

На скліканую пры аддзяленьні Камунбанку нараду па крэдытнай рэформе не каторыя кіраўнікі камунальных прадпрыемстваў зусім не зьявіліся. Камунтрэст паогул слаба кіруе правядзеньнем крэдытнай рэформы на сваіх прадпрыемствах, падрыхтоўкай іх да 1 лістапада.

А. Магідаў.

Канфэрэнцыя гаспадарча-разрахунковых брыгад

АДБУДЗЕЦЦА 10 ЛІСТАПАДА

ПРЭЗЫДЫУМ ЦСПСБ ПАСТАНАВІЎ ПЕРАНЕСЬЦІ СКЛІКАНЬНЕ ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ГАСПАДАРЧА - РАЗРАХУНКОВЫХ БРЫГАД НА 10 ЛІСТАПАДА 1931 ГОДУ. УСІМ РАЙГАРПРАФСАВЕТАМ ПРАПАНАВАНА ДА ГЭТАГА ЧАСУ (ДА 10 ЛІСТАПАДА) ПРАВЕСЬЦІ НАРАДЫ ГАСПАДАРЧА - РАЗРАХУНКОВЫХ БРЫГАД У ТЫХ ГАРАДОХ, ДЗЕ ЯНЫ ЯШЧЭ НЕ ПРАВЕДЗЕНЫ.

СЭКТАРУ БЫТВОРЧАСЬЦІ І ПЛЯНАВАНЬНЯ ПРАПАНАВАНА ВЫВУЧЫЦЬ РАБОТУ ГАСПАДАРЧА - РАЗРАХУНКОВЫХ БРЫГАД ПА АСОБНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ, ЗЬВЯРНУЎШЫ АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ НА ЎЛІК ЭФЭКТЫЎНАСЬЦІ ІХ РАБОТЫ.

МАБІЛІЗАЦЫЯ СРОДКАЎ

Ня зьніжаць заваяваных тэмпаў!

ВОРША І ЛЮБАНЬ ЗА ПЕРШЫЯ ДЭКАДЫ КАСТРЫЧНІКА ПАГОРШЫЛІ РАБОТУ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ

Пасылкай буксірных брыгад з перадавых раёнаў дабʼемся пералому ў выкананьні фінпляну па адсталых раёнах

Першыя дзьве дэкады кастрычніка сыгналізуюць аб пагрозе выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў IV кварталу. Замест узмацненьня тэмпаў назіраецца зьніжэньне.

Кожная дэкада ў сярэднім павінна даць ня менш 10 млн. руб. Між тым, у першую дэкаду кастрычніка паступіла ўсяго 5.600 тыс., у другую дэкаду—7.380 тыс. руб. пры паступленьні ў апошнюю дэкаду верасьня—8.350 тыс. руб.

Даныя па асобных раёнах паказваюць, што, побач з разгортваньнем работы ў радзе раёнаў, у некаторых раёнах ня ўлічваецца неабходнасьць ўпартай барацьбы за выкананьне пляну. Рад раённых арганізацый з самага пачатку кварталу паслабіў увагу да пытаньня мабілізацыі сродкаў. Барацьба за мабілізацыю сродкаў ня ўвязваецца з правядзеньнем іншых палітычна-гаспадарчых кампаній.

Бальшавіцкія ўзоры барацьбы за ажыцьцяўленьне фінпляну паказвае Сіроцінскі раён, які на 20 кастрычніка здолеў дабіцца 100-процантнага выкананьня месячнага заданьня. Значна прасунуліся наперад Заслаўскі, Прапойскі, Бабруйскі, Лёзьнянскі, Лепельскі і Жыткавіцкі раёны, якія за другую дэкаду кастрычніка дабіліся 60 проц. выкананьня пляну.

З гарадоў значна падцягнуўся Віцебск, які на 20 кастрычніка сабраў 58,3 проц. месячнага пляну, Гомель—56 проц. і Менск—55 проц.

Рад раёнаў, якія ў трэцім квартале дабіліся вялікіх посьпехаў выкананьня фінпляну, значна пасьлабілі тэмпы. Так, Аршанскі раён на 20 кастрычніка выканаў толькі 39,1 проц., Лэбаньскі—34,8 проц., Клімавіцкі — 29,1 проц., Старобінскі—26,3 проц. і г. д.

Зусім недапушчальна праходзіць збор сродкаў у Талочынскім, Чырвонапольскім, Веткаўскім, Бягомльскім, Клічаўскім, Бярэзінскім, Расонскім, Чэрвеньскім, Параўлянскім і Камарынскім раёнах, якія за дзьве дэкады кастрычніка ня здолелі дабіцца і 30 проц. месячнага пляну.

Такія тэмпы мабілізацыі сродкаў сьведчаць, што многія раёны да гэтага часу яшчэ ня ўключыліся ў правядзеньне фінансавай эстафэты і што падрыхтоўка да рапарту да дня XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў іх яшчэ не распачата.

Адстаючыя раёны павінны неадкладна падцягнуцца і ліквідаваць прарывы.

П.

ВІЦЕБСК ПА-УДАРНАМУ ЗМАГАЕЦЦА ЗА ФІНПЛЯН

Сакратару ЦК КП(б)Б тав. ГЕЮ і старшыні СНК—тав. ГАЛАДЗЕДУ; Наркамфіну—тав. ХАЦКЕВІЧУ і Рэдакцыі „Зьвязда"

НАДАЮЧЫ ВЫЛЮЧНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ ВЫКАНАНЬНЮ ФІНПЛЯНУ ДЛЯ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА 4-ГА КВАРТАЛУ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ, ВІЦЕБСКІ ГАРКОМ КП(б)Б І ГАРСАВЕТ УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ФІНЭСТАФЭТУ І ПАДРЫХТОЎКУ ДА РАПАРТУ ДА 14-ай ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

РАЗГОРТВАЕЦЦА МАСАВАЯ РАБОТА. МАБІЛІЗОВАН УВЕСЬ АКТЫЎ. У СЕЛЬСАВЕТЫ НАКІРОВАНЫ ЎПАЎНАВАЖАНЫЯ. БЯРЭМ НА БУКСІР АДСТАЮЧЫ СЕНЕНСКІ РАЁН, КУДЫ ВЫСЛАНА БРЫГАДА.

САКРАТАР ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б—СУДАКОЎ.
СТАРШЫНЯ ГАРСАВЕТУ—ЖУКОВІЧ.
ЗАГАДЧЫК ГАРФО—АДАМ.

Забясьпечым будаўніцтва МТС поўнай рэалізацыяй акцый Трактарацэнтру

Для ажыцьцяўленьня вялікага пляну будаўніцтва МТС, патрэбны вялізарныя грашовыя сродкі.

Урад у свой час прыняў пастанову аб прыцягненьні грашовых сродкаў калгаснага і бядняцка-серадняцкага сялянства на будаўніцтва МТС праз рэалізацыю акцый Трактарацэнтру.

На сёнешні дзень выкананьне заданьня партыі і ўраду па хутчэйшай рэалізацыі акцый Трактарацэнтру праходзіць надзвычайна марудна і гэта можа стварыць труднасьці ў завяршэньні будаўніцтва новых МТС да канца 1932 году. Гэта сьведчыць аб тым, што райком і РВК ня прынялі належных мер для пасьпаховага правядзеньня гэтага важнейшага палітычна-гаспадарчага мерапрыемства.

Райза, райкалгассаюзы і МТС павінны былі паказаць прыклады актыўнай і хуткай работы па зборы сродкаў на будаўніцтва МТС. Між тым, гадавое заданьне па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру па БССР на 1 кастрычніка выканана толькі на 46 проц.

Плян чацьвертага кварталу за першую дэсяцідзённую кастрычніка выкананы толькі на 3 проц.

Рад раёнаў далі зусім ганебныя паказальнікі рэалізацыі акцый. Так, Бярэзінскі раён выканаў 14 проц. пляну, Вузьдзенскі—6,3 проц., Лоеўскі—11,5 і г. д. Такія вынікі сьведчаць аб поўнай бязьдзейнасьці гэтых раёнаў.

Цэнтральныя дырэктыўныя органы СССР паставілі ў цэнтр увагі і ў цесную залежнасьць ад збору сродкаў па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру далейшае разгортваньне будаўніцтва машына-трактарных станцый, завоз трактараў і с-г. машын.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у спэцыяльнай тэлеграме прапанавалі райкомам і РВК ужыць выключныя меры для датэрміновага выкананьня пляну рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

Да канца 1931 году засталося толькі два месяцы. Райкомы і РВК павінны мабілізаваць усе сілы для забясьпячэньня выкананьня галавой задачы

Будаўніцтва МТС—справа самога насельніцтва.

КАРШАКЕВІЧ

МЦРК і Белгандаль „замаражваюць" таваразварот

Чацьверты квартал зьяўляецца рашаючым у адносінах выкананьня гадавога фінансавага фінпляну. На працягу гэтага кварталу павінны быць пакрыты тыя прарывы, якія былі дапушчаны на працягу ўсяго году. Аднак, сёнешнія тэмпы не забясьпечваюць стопроцантнага выкананьня фінансавых заданьняў.

Каапэрацыя і дзяржгандаль зусім невыстарчальна праламляюць у сваёй практычнай рабоце дырэктывы партыі аб максымальным павялічэньні таваразвароту, збору паёў і выкананьні касавых плянаў.

ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б у сваіх пастановах выразна адзначалі, што адным з галоўных стымулаў павялічэньня таваразвароту зьяўляецца перавод магазынаў на гаспадарчы разрахунак. Між тым, на сёнешні дзень Белгандаль фактычна перавёў на гаспадарчы разрахунак адзін магазын, а ЦРК — два. Белдзяржснаб таксама не перавёў свае крамы на поўны гаспадарчы разрахунак.

Паасобныя базы і магазыны нічога не робяць для хутчэйшага расоўваньня тавараў да спажыўцоў. Плян збору паёў таксама выконваецца вельмі дрэнна. Так, ЗГК мэталістаў выканаў плян збору паёў на 67 проц., ЗРК фабрыкі «Кастрычнік» — 36 проц. Зусім ганебна праходзіць збор паёў па МЦРК, дзе плян выканан толькі на 35 проц.

Фінэстафэта, якая зараз праводзіцца, павінна даць пералом у гэтай справе.

КЕЙЛІН.

Ножнай машыне —ГАСПАДАРЧАЕ ВОКА

БРЫГАДЗІР ЗАГОРСКІ ЗЛАЧЫННА РАСТРАЧВАЕ СОТНІ КІЛЁГРАМ ГАЗЫ

Адрамантаваць, змазаць і поўнасьцю захаваць усе сельска-гаспадарчыя машыны да веснавой сяўбы

Галавацяпскія загады

ДРЫСА. У калгасе «Бігосава» на вытворчай нарадзе многа раз пастанаўлялі аб рацыянальным скарыстаньні рабочай сілы, машын і асабліва трактараў. Аднак, тэхдырэктар Солдан сваімі галавацяпскімі загадамі ігнаруе пастанову вытворчай нарады. Так, 11 кастрычніка Солдан аддаў загад брыгадзіру Пурмальцу «пачынай зяблець вось гэты вучастак», у гэты самы час Солдан добра ведаў, што ніхуль ня будзе зроблена раскарчоўка, да зяблева на гэтым вучастку прыступаць нельзя.

У выкананьне загаду тэхдырэктара брыгадзір аддаў распараджэньне трактарыстам—выехаць і пачаць ворыва балота, кустоў і карчоў. Трактарысты лаюць Солдана апошнімі словамі—«тут можна паламаць усе машыны,—кажуць яны,—але загад ёсьць, загад грэшнага начальства трэба выконваць».

Што на справе атрымалася? Патрадзіўшы шмат гаручага, чатыры трактары за 32 гадзіны ўзаралі толькі 2 гэктары, якія ўсё роўна вялеой трэба будзе перавораць. Замест атыстых балот ад кустоў і карчоў, дырэкцыя губіць трактары, траціць марна гаручае і ніякага эфэкту ад гэтага не атрымлівае.

Алеталавацяпскія загады працягваюцца. Солдан аддае новы загад. Высылаецца на балота адзін трактар з плугам, спэцыяльна прыстасаваным для вораньня выкарчаваных глобы. Трактарыст правазіўся два дні і нічога не зрабіў, а плуг і да сёнешняга дня валяецца ў балоце. Солдан ніяк ня можа зразумець, што плуг сам ня можа выкарчаваць пні, а што трэба раней зрабіць расарчоўку, а потым араць.

Зьдзельная работа на трактарах ня ўведзена. Існуе падзённая аплата. Ад гэтага яшчэ больш псуюцца машыны, зьніжаецца прадукцыйнасьць працы.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці галавацяпаў за нерацыянальнае скарыстаньне трактараў, за марную трату гаручага. Неабходна зараз-жа ў саўгасе «Бігосава» ўвесьці прэміяльна-прагрэсыўную зьдзельшчыну, ліквідаваць абязьлічку, устанавіць адказнасьць за машыны. Не ігнараваць, а поўнасьцю трэба выкарыстоўваць усе капітоўныя прапановы, якія выносяцца на вытворчых нарадах рабочых.

Рабкоры: Мятла, Пчала, Гудок.

Эканоміць кожны кілёграм гаручага

У свой час трактарысты Вушацкай МТС заключылі паміж сабой сацдагавор, у якім прадугледжваліся пункты аб эканоміі гаручага і змазачнага.

Сацдагавор згублен. Аб праверцы яго выкананьня ніхто ня думаў. Але лепшая частка трактарыстаў пра сацдагавор не забылася — выдаткоўваць па 1 га пахаці 24 клгр., цаліны — 34 клгр. У атрадзе № 3 на чале з брыгадзірам Заблоцкім М. у жніўні выдаткоўвалася ў сярэднім на 1 га 21,7 клгр., у верасьні — 24,2 клгр. Атрад № 5 на чале з брыгадзірам Пахомка Апанасам у верасьні выдатквае 24 клгр.

Найлепшыя посьпехі ў барацьбе за эканомію гаручага паказаў атрад № 8 на чале з брыгадзірам Анкудовічам Улядзімерам. Брыгада дабілася ў верасьні выдатканьня на 1 га стара-пахатнай зямлі 23 кілё газы. Лепшая трактарыстка Дайпідзёнак Агапа ў часе веснавой сяўбы была прэміявана і дарэз зьяўляецца першым кандыдатам на атрыманьне прэміі.

Разам з гэтым з боку атраду № 6 ёсьць самыя агідныя адносіны да эканоміі гаручага і змазачнага. Брыгадзір Загорскі Браніслаў злачынна растрачвае сотні кілёграм газы. Гэты атрад у жніўні выдаткоўваў на 1 га стара-пахатнай зямлі 38,2 клгр., а ў верасьні звыш 40 клгр. Вельмі дрэнна працавалі трактарысты гэтага атраду Рубанік Васіль і Кнігіна Ф., якія для узьяўленьня 1 га траціли больш 45 клгр.

Дырэкцыя Вушацкай МТС не змагалася за эканомію гаручага. Прэміяльны фонд для прэміяваньня лепшых ударнікаў ня створан. Дырэкцыя ў самыя бліжэйшыя дні павінна дабіцца, каб ні аднаго кілёграму гаручага не прападала даремна.

Ліпаўка Ян.

Трактары яшчэ абязьлічаны

СЛУЦАК. Абязьлічаны трактар — яшчэ звычайнае зьявішча ў рабоце Слуцкай МТС. Да ліквідацыі абязьлічкі ня з боку дырэкцыі, так і з боку рабачкому ніякіх захадаў ня прымаецца. Барацьба за эканомію гаручага і змазачнага не пастаўлена ў цэнтр увагі ўсяго рабочага калектыву. Адсутнасьць зьдзельшчыны і абязьлічка прывялі да таго, што ў калгасе «Камінтэрн» тры трактары за цэлы дзень узаралі толькі 1,5 гэктара. Трактарысты працавалі з халадком, часта спынялі работу і інш. Такое становішча ёсьць і ў калгасе «Чырвоны працаўнік». З прысланай брыгадай з чатырох трактараў фактычна працавалі, дый тыя бяз поўнай нагрузкі, толькі два трактары і г. д.

Барацьба з абязьлічкай, поўнае ўкараненьне зьдзельнай сыстэмы работы, эканомія гаручага — асноўныя задачы, за якія павінна змагацца Слуцкая МТС.

А.

Машыны—пад дажджом

КАПЫЛЬ. У калгасах «Кастрычнік» і імя Варашылава панує поўная абязьлічка ў карыстаньні сельска-гаспадарчымі машынамі. Ня гледзячы на тое, што ўборка даўно скончана, аднак, жнівяркі, касілкі і іншыя сельска-гаспадарчыя машыны ў беспарадку валяцца па дварэ пад дажджом. Такое становішча наглядаецца ў большасьці калгасаў раёну і МТС.

Райкалгассаюз замест выкананьня дырэктыў Калгасцэнтру аб захаваньні на зіму сельска-гаспадарчых машын, бязьдзейнічае і ніякіх мер да захаваньня машын не ўжывае. Работнікі райкалгассаюзу лічаць пытаньне абязьлічкі другарадным пытаньнем, а агранам адказвае: «Весьці барацьбу з абязьлічкай—ня наша справа».

Райкалгасаюз павінен у самы найкаранейшы тэрмін адшукаць асобныя памяшканьні, прымусіць кожны калгас адрамантаваць, змазаць і скласьці машыны. Кожная машына павінна быць добра і цалкам захавана да веснавой сяўбы.

ВАРЭВАЦКІ.

Малатарні не выкарыстоўваюцца

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. Машыны, якія прыбываюць на адрас МТС, па прызначэньні не выкарыстоўваюцца. Частка машын стаіць у гумне, а частка яшчэ валяецца на станцыі. Ільнацэрэбілкі, буль бакапалкі, сілаасарэзкі стаяць пад адкрытым небам, іржавеюць і псуюцца.

Малатарань у калгасы дырэкцыя МТС не завезла. Яны стаяць на складах бяз дзеяньня.

Дырэкцыя МТС павінна поўнасьцю захаваць усе сельска-гаспадарчыя машыны на зімовы час. Неадкладна перакінуць у калгасы ўсе малатарні, поўнасьцю іх выкарыстаць на малацьбе, гэтым самым паскорыць тэмпы выкананьня пляну па загатоўках.

З—н.

Матар'ялы для дакладчыкаў*) да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі

ныя паказальнікі ня выкананы і ўсё яшчэ вельмі нізкія. Па радзе галін ня выконваюцца і колькасныя паказальнікі. Рост прадукцыйнасьці працы таксама адстае ад пляну. Яшчэ далёка ня ўсюды ліквідавана цякучасьць рабочай сілы і папаўненьне рабочых кадраў арганізаваным наборам у парадку дагавароў з калгасамі, яшчэ далёка ня зьнішчана ўраўнілаўка, не ліквідавана абязьлічка, правільна не расстаўлены сілы на прадпрыемстве. Не арганізавана правільны гаспадарчы разьлік; яшчэ далёка ня выкарыстаны ўсе крыніцы снутры-прамысловага накапленьня; яшчэ многія рэсурсы на прадпрыемствах ляжаць безкарысна; многа яшчэ трэба зрабіць для паляпшаньня бытавых умоў і харчовага забесьпячэньня рабочых. Трэба дабіцца сур'ёзнага павышаньня ўзроўню тэхнічнай пісьменнасьці ўсяго рабочае масы, аўладаньня тэхнікай вытворства ўсім камандным складам прамысловасьці.

Гэтыя задачы будуць выкананы рабочай клясай Беларусі разам з усім рабочым Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам кампартыі. К 14-ай гадавіне Кастрычніка павінны быць уцягнуты новыя сотні тысяч рабочых у справу будаўніцтва, трэба арганізаваць вакол форм створаных самым масавым рухам рабочых, вакол зьменна-сустрочных пляноў, грамадзкіх буксіраў, новую хвалю працоўнага гераізму. Ужо ў сярэдзіне 1931 году на 94 найбольш буйных прадпрыемствах каля 60 проц. (59,5 проц.) усіх рабочых ахоплена рухам ударніцтва. Мы гэты процант павінны значна павялічыць.

III.

У бязьлітасным клясавым змаганьні перамагаюць ачуранўўленьне кулацтва. СССР дабіўся вялікіх посьпехаў у галіне сельскай гаспадаркі. Краіна дробнай распыленай гаспадаркі з нікчэмным ужываньнем машын, нікчэмнай тэхнічнай базай, з вельмі нізкім культурным і матэрыяльным узроўнем жыцьця ператварана большасьці сілян, уже абарнулася ў краіну самага буйнога зямлеробства ў сьвеце, дзе шматаныя шчэ гістоты сацыялістычныя формы буйнай сельскай гаспадаркі вдчыняюць неабсяжныя пэрспэктывы ў справе механізацыі і трактарызацыі вёскі, вялізнага павышэньня ўраджаю ўсіх сельскагаспадарчых культур, шматкратнага павышэньня дабрабыту мільёнаў бядняцка - сераднякіх гаспадарак — 60 проц. усіх гаспадарак СССР увайшлі ў калгасы 1400 машынна-трактарных станцый аказваюць рашаючую дапамогу сацыялістычнай перабудове сельскае гаспадаркі і звыш 200 трактараў выходзяць кожны дзень на поля Савецкага Саюзу трактарныя станцыі (Сталінградзкі, Пушлаўскі, Харкаўскі). За два апошнія гады пасеўная плошча павялічылася на 18 мільёнаў гэктараў, калі як за 10 год перад вайной уся пасеўная плошча вырасла на 15 мільёнаў гэктараў. Адны саўгасы, якія засеялі вясной 1928 году 0,8 мільёна га, ужо вясной 1931 году засеялі 8 мільёнаў га.

У асноўных збожжавых і сырцовых раёнах выканана дырэктыва партыі аб суцальнай калектывізацыі і на гэтай базе завяршаецца ліквідацыя кулацтва, рэшткі якога, аднак, яшчэ энэргічна супраціўляюцца, спрабуюць разлажыць калгасы знутры, іграючы на спажывецкіх настроях адсталай часткі калгасьнікаў, высоўваючы лёзунг аб выкананьні абавязкаў перад рабочай дзяржавай у апошнюю чаргу.

Удзельная вага кулацка-заможных гаспадарак у агульным балянсе сельскае гаспадаркі значна зьменшылася (замест 10 проц. таварных лішкаў хлеба, якія яны мелі ў 1929-30 г., у 1930-31 г. яны маюць толькі 4 проц.).

БССР, дзякуючы брацкай дапамозе ўсіх Савецкіх Рэспублік, таксама дабілася вялізарных посьпехаў. Год таму назад толькі 12 проц. гаспадарак (з 16 проц. пасеўнай плошчы) знаходзілася ў калгасах, цяпер палова ёсьць бядняцка-сераднякіх гаспадарак БССР абъедины ў калгасы.

Плошча саўгасаў БССР год таму назад складала 379 тысяч га, цяпер іх пасеўная плошча дасягнула 610 тысяч га.

Трактарны парк, які налічваў к 1-му студзеня 1930 году 200 трактараў, цяпер даведзен да 1.740 трактараў; цяпер 6 машынна-трактарных станцый, якія былі ў 1930 годзе, цяпер ёсьць 33 такіх станцыі.

З тыпова спажывецкай краіны, Беларусь ператвараецца ў краіну сацыялістычнай буйной гаспадаркі, у краіну разьвітай сацыялістычнай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур.

Агульная пасеўная плошча ў 3.389 тысяч га ў 1930 г. павялічылася на 17 проц. — да 3.974 тысяч га. Пасеўная плошча ільну і канапель, якая складала ў мінулым годзе каля 150 тысяч га, у гэтым годзе даведзена да 280 тысяч га. Для апрацоўкі ільну на тэрыторыі БССР будуюцца ў гэтым годзе 47 новых ільназаводаў.

У 1923 годзе абожжавыя культуры складалі 82,7 проц. пасеўнай плошчы, у 1931 годзе яны складаюць 55,2 проц., культура бульбы павышаецца з 11,4 проц. да 16,4 проц., ільну і канапель з 3,1 проц. да 7,1 проц., а плошча пашчэ ных траў і іншых культур з 2,8 проц. павышаецца ў 1931 годзе да 18,3 проц.

Гэтыя посьпехі павінны зрабіцца асновай для яшчэ большага прасоўваньня наперад на шляху далейшай сацыялістычнай перабудовы вёскі, для максымальна хуткай ліквідацыі недалікаў і прарываў, якія маюцца на асобных вучастках. Мы маем дастаўленьне ў правядзеньні раду гаспадарча - палітычных кампаній, у правядзеньні збожжазагатовак, камплектаваньні сьвіных стадаў, падняцьці зяблева, адпраўцы бульбы для пралетарскіх цэнтраў Савецкага Саюзу, у радзе калгасаў ёсьць рвацкія тэнденцыі.

Усе гэтыя прарывы павінны быць ліквідаваны на аснове бязьлітаснай барацьбы з кулацтвам, якое вядзе тактыку разлажэньня калгасаў знутры шляхам раздуваньня дробна-ўласьніцкіх і спажывецкіх настрояў, палітрыманьнем дробна - буржуазнай ураўнілаўкі, падштурхваньнем да ўстанаўленьня непамерных і недарэчных норм аплаты па працаднёх, да праўмяншэньня лічбаў ураджаю і праўвялічэньня патрэбнасьцей самаго калгасу.

Асноўнай задачай перад калгасным рухам БССР, як і ўсяго Савецкага Саюзу, зьяўляецца цяпер задача арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

«Правільна арганізаваць працу, укараніць зьдзельшчыну ва ўсіх відах працы, наладзіць яе дакладны ўлік, ліквідаваць абязьлічку, вытравіць з калгаснай практыкі дробна-буржуазную ўраўнілаўку» — гэтыя задачы, высунутыя ў адозьве ЦК КП(б)Б да ўсіх рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў зьяўляюцца баявой праграмай, хуткае выкананьне якой забясьпечыць ліквідацыю прарываў, перш за ўсё ў абсягу найважнейшай галіны сельскае гаспадаркі БССР — жывёлагадоўлі, дзе, ня гледзячы на буйнейшыя посьпехі, плян ня выканан, забясьпечыць сваячасное выкананьне асноўных сельска-гаспадарчых кампаній — уборку і загатоўку гародніны і бульбы, апрацоўку і здачу ільну, выкананьня збожжазагатовак, адгрузку гародніны для пралетарскіх цэнтраў і г. д.

IV.

Ва ўсіх астатніх галінах гаспадарчага будаўніцтва, так як у прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы, БССР, як і ўвесь Савецкі Саюз мае вялізарныя дасягненьні і стаіць перад яшчэ большымі задачамі.

Асаблівя вялікія гэтыя задачы, ў галіне транспарту, дзе ва што-б там ні стала павінны быць забясьпечаны асеньня-зімовыя перавозкі, павінна быць замацавана спаранная язда, ліквідавана абязьлічка, выканан плян рамонтных работ. Значныя посьпехі мы маем і ў галіне сацыялістычнай рэарганізацыі камунальнай гаспадаркі на Беларусі і задавальненьня матар'яльна - бытавых патрэб працоўных БССР. У Менску пабудован трамвай, праведзена каналізацыя, уведзена мэханізаванае хлебапячэньне, пабудаваны рад вялікіх дамоў. Гэтыя посьпехі, аднак, зусім ня могуць задаволіць узрастаючых патрабаваньняў рабочае клясы Савецкай Беларусі. Значна павялічыць тэмпы камунальнага будаўніцтва, палепшыць работу снабжэнчых арганізацый і каапэрацыі — такія задачы стаяць перад намі да 14 юбілею Кастрычніка.

Да 14-й гадавіны Кастрычніка, падводзячы ітогі найвялікшым дасягненьням гаспадарчага будаўніцтва, трэба памятаць словы тав. Леніна, сказаныя яшчэ 10 год назад: «Цяпер галоўнае сваё ўзьдзейнічаньне за міжнародную рэвалюцыю мы робім сваёй гаспадарчай палітыкай. Усе на Савецкую Расійскую рэспубліку глядзяць, усе працоўныя ва ўсіх краёх сьвету бяз выключэньня і без усякага праўвялічэньня... На гэтую арэну змаганьне перанесена ў сусьветным маштабе. Вырашым гэту задачу — і тады мы выйграем у міжнародным маштабе, напэўна і канчаткова. Таму пытаньні гаспадарчага будаўніцтва набываюць для нас значэньня зусім выключнае».

V.

14-я гадавіна Кастрычніка сьвяткуецца працоўнымі СССР і БССР у абстаноўцы гістарычных перамог савецкага пралетарыяту ня толькі на фронце гаспадарчага будаўніцтва, але і на фронце культурным, у абстаноўцы магутнага размаху культурнай рэвалюцыі.

Нарастаючыя патрэбы сацыялістычнага будаўніцтва тое, што мы ўступілі ў перыяд сацыялізму, паставілі перад партыяй задачу яшчэ больш шпаркага разьвіцьця навукі і тэхнікі, пашырэньня існуючых кадраў па ўсіх галінах і стварэньня сваёй уласнай навуковай і вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі. «Наш Край уступіў у такую фазу разьвіцьця, калі рабочая класа павінна стварыць сабе сваю ўласную вытворча-тэхнічную інтэлігенцыю, здольную абараняць ня інтарэсы ў вытворчасьці, як інтарэсы пануючай клясы. Ні адна пануючая класа не абыходзілася без сваёй уласнай інтэлігенцыі» (Сталін).

Да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў СССР і БССР мы маем такое становішча, калі гістарычныя перамогі ў змаганьні за сацыялізм, разгром шкодніцкай ідэалогіі стварылі паварот перажаўчкай часткі старой інтэлігенцыі на бок савецкай улады і актыўнага змаганьня за сацыялізм.

«Новая абстаноўка павінна была стварыць і сапраўды стварыла новыя настрої сярод старой тэхнічнай інтэлігенцыі» (Сталін).

У той час, як у капіталістычных краёх мы маем гвалтоўны нацыянальны ўціск, які затрымлівае разьвіцьцё прыгнечаных мас, у СССР мы маем вялікі ўздым культурнага будаўніцтва нацыянальных рэспублік і абласьцей на лініі ліквідацыі фактычнай нераўнасьці паміж народамі СССР.

Будаўніцтва нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце культуры Беларусі, як часткі сацыялістычнага будаўніцтва СССР, мае свае асаблівасьці і труднасьці, якія зьяўляюцца вынікам усяго папярэдняга гістарычнага разьвіцьця Беларусі ў рамках самаздзяйснаўя.

Труднасьць нацыянальна-культурнага будаўніцтва павялічвалася агульнай культурнай адсталасьцю Беларусі і амаль поўнай адсутнасьцю пралетарскіх нацыянальных кадраў інтэлігенцыі. Перад КП(б)Б стала задача побач з уцягненьнем блізкай да пралетарыяту старой інтэлігенцыі у сацыялістычнае будаўніцтва і выхаваньне ня ў пралетарскім кірунку — стварэньне сваёй уласнай інтэлігенцыі пралетарыяту па ўсіх галінах навукі, тэхнікі, мастацтва і г. д.

Ня гледзячы на ўсе труднасьці культурнага будаўніцтва, на спадчыну мінулага, мы маем па аснове разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, дзякуючы няўхільнаму правядзеньню ленінскай нацыянальнай палітыкі і рашучаму змаганьню з усялякімі адхіленьнямі ад яе, вялікія дасягненьні і бурныя тэмпы культурнага будаўніцтва.

У той час, калі процант няпісьменных на Беларусі ў 1920 годзе складаў звыш 68,5 проц. у адносінах да ўсяго насельніцтва, то ў 1930 годзе процант няпісьменных складаў усяго толькі 27 проц., а для 1931-32 нав. году КП(б)Б пастаўлена задача ліквідаваць няпісьменнасьць усяго насельніцтва. Менск ужо да 14-й гадавіны Кастрычніка становіцца горадам усеагульнай пісьменнасьці.

Школьнае будаўніцтва БССР ідзе шпаркімі тэмпамі наперад: так, за пэрыяд 1921-22—1930-31 нав. гадоў колькасьць 4-хгодак павялічылася прыблізна ў 3-5 раз, а сямігодак — у 4-5 раз.

БССР першай па Саюзе ўвяла ўсеагульнае абавязковае навучаньне. Адна-ведна росту кол

Год выданьня—XV
№ 297 (4293)
Субота, 31 кастрычніка
Цана нумара 6 кап.
выходзіць
БЕСЫПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, СВЕРДЛОВА, 60.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27), —сакратар—10-74, партсакратар—13-80, прамысл.—13-80, сав. замл.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замест. інфарм.—6-19, нач. рэдактар—6-42, міжгародняя інфармацыя—10-74, аб'ем рукапісаў—[illegible]

„У Нямеччыне дрэнна, але будзе яшчэ горш"—так заяўляе Брунінг

Мэталісты Бэрліну рыхтуюцца да агульнай забастоўкі

«ВЫКЛЮЧНЫЯ МЕРЫ» ГОЛАДУ ДЛЯ МАС

БЭРЛІН, 29. Адкрылася пад старшынствам Гіндэнбурга, у прысутнасьці Брунінга і іншых членаў ураду, першае пасяджэньне ЭКАНАМІЧНАЙ РАДЫ. Ва ўступным слове Гіндэнбург указаў, што з прычыны цяжкага крызысу сусьветнай гаспадаркі і выключна цяжкага эканамічнага становішча ў Нямеччыне, многія ўжо страцілі ўпэўненасьць у магчымасьці аздараўленьня народнай гаспадаркі. «Нямеччына павінна палепшыць сваё становішча ўласнымі сродкамі, ідучы па шляху выключных мер. Гіндэнбург выказаў надзею, што «дзейнасьць эканамічнага савету паспаслабіць сацыяльна-эканамічныя і гаспадарчыя супярэчнасьці».

Брунінг, які выступіў усьлед за Гіндэнбургам, заявіў, што эканамічнае становішча ў Нямеччыне за апошні час пагоршылася. Паводле слоў Брунінга нямецкай гаспадарцы пагражаюць новыя небясьпекі, бо трэба чакаць, што ангельскі ўрад у[illegible] абарончыя мыты, якія паставяць [illegible]ога перашкод перад нямецкім экспартам у Англію. Нямеччына, сьцьюярджаў Брунінг, ня можа пайсьці па шляху інфляцыі падобна Англіі і іншым краінам, таму, што інфляцыя абясьцэніла-б капіталы і зьберажэньні. Нямеччыне застаецца толькі стаць «танкай краінай» пры захаваньні стабільнай валюты.

Далейшыя нарады адбываліся ў строга-сакрэтным парадку. Як паведамляюць з колаў блізкіх да ўраду, апошні мае намер утрымаць канкурэнтаздольнасьць Нямеччыны ў адносінах да краін з інфляцыйнай валютай наступнымі сродкамі: СКАРАЧЭНЬНЕ ЗАРПЛАТЫ, НЯ СПЫНЯЮЧЫСЯ ПЕРАД ЗБНІЖЭНЬНЕМ ЗАКЛЮЧАНЫХ КАЛДАГАВОРАЎ, ЗАБАРОНЫ ІМПАРТУ НЕКАТОРЫХ ТАВАРАЎ, ЯКІЯ НЯСПРЫЯЮЧА УПЛЫВАЮЦЬ НА ГАДАВЫ БАЛЯНС НЯМЕЧЧЫНЫ І Г. Д.

ШТАБЫ БАРАЦЬБЫ СТВОРАНЫ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ.

БЭРЛІН, 28. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі рабочыя стварылі на 80 прадпрыемствах мэталяпрамысловасьці (з 100) рэвалюцыйныя камітэты барацьбы.

Праўленьне рэфармісцкага прафсаюзу разаслала ліст усім сацыял-дэмакратычным актывістам фабзаўкомаў, у якім прапануецца не паведваць фабрычна-заводзкія сходы, што склікаюцца рэвалюцыйным прафсаюзам.

Рэфармісцкія прафбюракраты распаўсюджваюць хлусьлівыя весткі аб тым, што правядзеньне ў жыцьцё скарачэньня зарплаты адтэрмінована.

РЭВАЛЮЦЫЙНЫ СЯЛЯНСКІ ДЗЕНЬ У НЯМЕЧЧЫНЕ

Бэрлін, 29. ЦК кампартыі Нямеччыны выпусьціў адозву да ўсіх рабочых і працоўных сялян з заклікам прыняць удзел у «сялянскім дні», які праводзіцца кампартыяй 15 лістапада. Кампартыя заклікае працоўныя масы гораду і вёскі арабіць 15 лістапада днём рабочых і сялян, днём барацьбы за правядзеньне рэвалюцыйнай праграмы сялянскай самадапамогі.

ЛЮТУЕ ПАЛІЦЭЙСКІ ТЭРОР

БЭРЛІН, 29 Паліцэйскі тэрор супроць кампартыі лютуе з рашэйшай сілай. Пасьля вобыску ў памяшканьні ЦК кампартыі, у камітэтах у Гельзэнкірхене і раду вобыскаў у кіруючых работнікаў кампартыі — паліцыя ўчора арыштавала ў Гельзэнкірхене трох членаў кампартыі, па абвінавачаньні ва ўдзеле ў забойстве паліцэйскага.

БАНКІ СПЫНІЛІ ПЛАЦЯЖЫ

БЭРЛІН, 29. Акцыянэрны рэйнскі сялянскі банк у Кельне, а таксама аддзяленьні ў Гладбаху і Клеве спынілі плацяжы.

ЗВОЛЕНЫ 800 РАБОЧЫХ

БЭРЛІН, 29. Вагонабудаўнічы завод Лінке-Гофман у Брэслаўлі рашэньнем кампартыі 15 лістапада цэху закрыць цяпер і машынабудаўнічы цэх. У сувязі з гэтым будуць зволены 800 рабочых.

89 ПРОЦ. АДКІНУЛІ РАШЭНЬНЕ СУДА

БЭРЛІН, 29. Паводле паведамленьня з Гамбурга, 89 проц. партавых рабочых адкінулі пры галасаваньні рашэньне трацейскага суда аб скарачэньні зарплаты на 10 проц.



ПАЗШ рыхтуюцца да вайны. На здымку: — дэманстрацыя новай далёнабойнай гарматы. Гэта гармата выкідвае снарады вагою ў 1.560 хунтаў на адлегласьці 14 міль.

Канкрэтныя сацыялістычныя абавязацельствы

ЦСПСБ і Савпрафу Зах. вобласьці па пытаньні правядзеньня перавыбарчай кампаніі фабзаўмясцкома

У мэтах найлепшага ажыцьцяўленьня задач, што стаяць у справаздачна-перавыбарчай кампаніі ФЗМК, ІТС, студпрафарганізацый, якія (задачы) вынікаюць з адозвы УсеЦСПС, пастаноў сакратарыяту УсеЦСПС, сталінскай эстафеты «IV год пяцігодкі» і конкурсу на ўдарны гаспадарча-разрахунковы цэх і гаспадарча-разрахунковую брыгаду, у дадатак да сацыялістычнага дагавору паміж ЦСПСБ і прафсаюзамі Заходняй вобласьці, заключаецца гэты сацыялістычны дагавор на лепшае ўзорнае правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі нізавых прафарганізацый, ЦСПСБ і савпраф Заходняй вобласьці высоўваюць і бяруць на сябе наступныя канкрэтныя абавязацельствы:

1. Забясьпечыць стопроцантны ўдзел рабочых, ІТР, студэнцтва і ўсёй прафсаюзнай масы на справаздачна-перавыбарчых сходах, пад лёзунгам: «Кожны член прафсаюзу дае ня менш, як адну прапанову на палянішэньні прафсаюзнай работы».

2. Цягнуць у рады ўдарнікаў ня менш, як на 5.000 рабочых.

3. У часе перавыбарчай кампаніі разгарнуць шырокую палітыка-выхаваўчую работу і забясьпечыць перадачу ў ленінскую партыю і ленінскі камсамол лепшых рабочых, работніц — энтузіястаў-ударнікаў.

4. Апрача ўзятых абавязацельстваў (арганізацыя 250 гаспадарча-разрахунковых брыгад) арганізаваць у перыяд справаздачна-перавыбарчай кампаніі з 25 кастрычніка па 25 лістапада ня менш, як па 500 разрахунковых брыгад, забясьпечыўшы пастаноўку ўліку эфэктыўнасьці работы як існуючых брыгад, так і тых, што арганізоўваюцца. Разам з гэтым разгарнуць шырокую работу па арганізацыі цэхаў гаспадарча-сацыялістычнага разрахунку (цэхам гаспадарча-сацыялістычнага разрахунку лічыцца той, у якім усе рабочыя ахоплены сацыялістычна-гаспадарчымі разрахунковымі брыгадамі).

5. Забясьпечыць узрост прафсаюзнага членства на Заходняй вобласьці і Беларускай Сацыялістычнай Рэспубліцы ў пэрыяд правядзеньня кампаніі ня менш, чым на 10 проц.

6. Цягнуць добраахвотны актыў у работу ЦСПСБ і савпрафу Заходняй вобласьці па сэктарох, МБіТ і таварыству вынаходнаў — ня менш 400 чалавек, з іх 150 чалавек — спэцыялістаў і ня менш 550 чалавек, уключаючы і спэцыялістаў, у работу ЦП саюзаў Беларусі і абласных камітэтаў Заходняй вобласьці.

7. Мабілізаваць у дапамогу ФЗМК па правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі ня менш, як па 100 чалавек адказных работнікаў савпрафаў, абласных камітэтаў і ЦП саюзаў.

8. Сіламі брыгад заходняга-абласнога савпрафу, абласных камітэтаў, Белсавпрафу і ЦП саюзаў арганізаваць ўзорна-прыкладную справаздачна-перавыбарчую кампанію ў важнейшых прадпрыемствах і вядучых галінах прамысловасьці.

9. Мабілізаваць слухачоў прафшкол: па лініі Белсавпрафу — рэспубліканскіх школ — 100 чалавек, па лініі абласкіх школ — 100 чалавек, на перавыбарчую кампанію ФЗМК, ІТС, студэнцкіх прафарганізацый.

10. Забясьпечыць у складзе новавыбраных прафсаюзных органаў ня менш 30 проц. жанчын, 25 проц. — моладзі, 20 проц. спэцыялістаў і ня менш 50 проц. рабочых і работніц — старых кадраў.

11. Арганізаваць пасьля справаздачна-перавыбарчай кампаніі вакол рэспубліканскай і абласной школ з актыву сэмінар-курсы па падрыхтоўцы новага складу ФЗМК ня менш, як 500 чалавек да 1-га сьнежня г. г.

12. Усю культурна-масавую і мастацкую работу клюбаў, чырвоных куткоў, насьпечаных і заводзкіх газэт падпарадкаваць справаздачна-перавыбарчай кампаніі нізавых прафарганізацый, забясьпечыўшы штодзённае апэрацыйнае асьвятленьне ходу справаздачна-перавыбарчай кампаніі і мабілізацыю шырокай грамадзкасьці на рэалізацыю ўсіх задач, што высунуты адозвай УсеЦСПС і гэтым саддагаворам.

13. Разгарнуць масавую работу па папулярызацыі прафдруку, павялічыўшы колькасьць падпісчыкаў на газэту «Труд» ня менш, чым да 1.000 экзэмпляраў.

14. Правесьці на Заходняя вобласьці і БССР па тры радыё-нарады-канфэрэнцыі прадпрыемстваў аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

15. Забясьпечыць па лініі нізавых прафарганізацый правядзеньне фінансавай эстафеты да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, ахапіўшы ў чарговай справаздачна - перавыбарчай кампаніі ўсіх рабочых і членаў прафсаюзу пазыкай «Троці рашаючы», праводзячы работу на стопроцантным афармленьні падпіскі.

16. Дабіцца на кожным буйным прадпрыемстве арганізацыі сьпіна-алкоўмасных пунктаў, павялічыўшы камплектаваньне існуючага стада на 20 проц.

17. Забясьпечыць зьмяшчэньне падкадных зводак аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў рэспубліканскім і абласным друку.

18. Кожную пяцідзённку прадстаўляць ва УсеЦСПС інфармацыйныя зводкі аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі нізавых прафарганізацый.

19. За лепшае правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі ўстанавіць заходня-абласному савпрафу і Белсавпрафу 6 прэмій для ФЗМК, у тым ліку на адной прэміі — для ЦП саюзаў і абласных камітэтаў, асыгнаваўшы для гэтай мэты ад кожнага савпрафу по 5.000 рублёў.

ПРАДСТАЎНІК ЗАХОДНЯГА АБЛАСНОГА САВПРАФУ.
ПРАДСТАЎНІК БЕЛСАВПРАФУ.

Памяці правадыра Чырвонай арміі М. В. Фрунзэ

1925 | 1931

6 год мінула з дня сьмерці тав. Фрунзэ.

Уся партыя, маса рабочых і калгаснікаў нашай краіны, перадавыя рабочыя ўсяго сьвету ведаюць і помняць яго, як аднаго з самых выдатных будаўнікоў і кіраўнікоў нашай партыі, як самаадданага рабочай справе сталёзага пралетарскага рэвалюцыянэра.

Тав. Фрунзэ быў выдатным бальшавіцкім арганізатарам, выдатным прамоўцай, тэарытычна адукаваным ленінцам. Характэрнай рысай Міхала Васільевіча быў яго пастанны, выключны інтарэс да пытаньняў арганізацыі узброеных сіл пралетарыяту. Гэты інтарэс падаўмачайна выпукла выяўляўся ў яго падполлі і асабліва за апошнія 8 год яго жыцьця. І недарма М. В. Фрунзе ў гады грамадзянскай вайны стаяў на чале цэлага раду важнейшых баявых апэрацый на важнейшых участках чырвонага фронту.

Пасьля сканчэньня грамадзянскай вайны Міхал Васільевіч шчыльна падыходзіць да распрацоўкі пытаньняў ваеннай тэорыі і ставіць перад Чырвонай арміяй цэлы рад важнейшых тэарытычных праблем. І калі ідэёвая спадчына Фрунзэ зьяўляецца і цяпер крыніцай кіраўнічых дырэктыў у развіцьці ваеннай справы пралетарскай дыктатуры, дык асабліва значэньне імёна з гэтага пункту гледжаньня мае яго тэарытычная работы.

Вырасла магутная сацыялістычная індустрыя, краіна адсталай працаедаўскай тэхнікі ператвараецца ў краіну перадачую, у краіну індустрыяльную.

За 6 год з дня сьмерці тав. Фрунзэ зусім зьмяніўся твар краіны Саветаў. Большасьць працоўных сялян увайшла ў калгасы і стала сапраўды моцнай апорай савецкай ўлады на вёсцы. Гэта ў корані мяняе сацыяльную і матар'яльную базу Чырвонай арміі, узмацняе абароназдольнасьць нашай краіны. Але і зараз мы знаходзім у працах т. т. Фрунзэ багацейшую скарбніцу мысьлі і ўказаньняў у справе рэканструкцыі Чырвонай арміі.

Памяць тав. Фрунзэ будзе вечна жыць сярод рабочых і працоўных нашай краіны.

А. Б.

Адкрыўся зьезд таварыства „Прыхільнік дзяцей"

Учора 29 кастрычніка адкрыўся першы ўсебеларускі зьезд таварыства «Прыхільнік дзяцей».

Таварыства падыходзіць да зьезду з ралам посьпехаў у рабоце. Па большасьці раёнаў створаны раённыя камітэты таварыства «Прыхільнік дзяцей», якія заняліся справай палянішэньня сацыяльна-бытавых умоў дзяцей працоўных. У раёнах адкрыты дзесяткі майстэрань для бяспрытульных, якія абслугоўваюць тысячы дзяцей. Перагросткі, якія ўжо адпрацавалі значны час у майстэрнях, перадаюцца на вытворчасьць. За гэты час перадана вытворчасьці больш 200 чалавек.

У гэтым годзе адкрыўся ўсебеларускі дзіцячы дом адпачынку.

Праведзена значная работа па аздараўленьні быту дзіцячых устаноў (дзіцячых дамоў, школ, дзіцячых ясьлей, садоў, пляцовак і інш.). Выдана на санітарна-аздаравіцельныя мерапрыемствы 25.000 руб. У фонд імя Леніна асыгнавана 28.000 руб.

На зьезьдзе павінен быць выбраны новы цэнтральны камітэт таварыства «Прыхільнік дзяцей».

Дэлегацыя польскіх калгасьнікаў выяжджае на Украіну

КОЙДАНАВА. (БЕЛТА). РАЁННЫ ЗЬЛЁТ ПРАДСТАЎНІКОЎ ПОЛЬСКІХ КАЛГАСАЎ ВЫБРАЎ ДЭЛЕГАЦЫЮ З ЛЕНІНЬСКІХ КАЛГАСЬНІКАЎ - УДАРНІКАЎ ДЛЯ ПАЕЗДКІ НА УКРАІНУ Ў МАРХЛЕЎСКІ РАЁН, КАБ ДАПАМАГЧЫ МЯСЦОВЫМ КАЛГАСАМ У АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧЫМ ЗАМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ І ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У СЬВЯТКАВАНЬНІ 14-АЙ ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

БРЫГАДА ВЫЯЖДЖАЕ 2-ГА ЛІСТАПАДА.

Дырэктыву аб зьніжэньні цэн

выканаць выразна і сваячасова

Лепшая гарантыя—кантроль рабочай грамадзкасьці

Зьніжэньне цэн у магазынах дзяржаўнага гандлю

Белгандаль прапанаваў усім сваім аддзяленьням і магазынам безадкладна прыступіць да рэалізацыі пастановы камітэту цэн пры Савеце Працы і Абароны аб зьніжэньні цэн. Ствараецца спэцыяльная камісія па праверцы цэн. У раёны для гэтай мэты выяжджае прадстаўнік Белгандлю.

Цэны ў камэрцыйных магазынах Дзяржгандлю Беларусі зьніжаюцца наступным чынам: паліто замест 150 руб.—105 руб., мужчынскі гарнітур адпаведна 120 руб. — 86 руб., жакет — 75 руб. — 56 руб., каўбаса кілёграм 9 руб.—6 руб. 50 кап. і 7 руб. — 4 р. 90 к., сыр галандзкі 11 р. — 8 р., рыбныя кансэрвы каробка з 1 р. 75 к. — 1 р. 20 к. і г. д. Цэны ўваходзяць у моц з 1 лістапада.

Для кантролю за цэнамі і хутчэйшага выкананьня пастановы камітэту цэн у дапамогу Белгандлю прыцягваецца рабочая грамадзкасьць і, у прыватнасьці, ударнікі хлебазаводу, заводу «Ударнік» і г. д.

Пераходны чырвоны сьцяг лепшаму магазыну

Прэзыдыум ЦП саюзу каапэрацыі і дзяржгандлю ўстанавіў чырвоны пераходны сьцяг для перадачы таму калектыву, які да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі канчаткова завершыць перабудову сваёй работы, згодна майскай адозвы ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу. Апрача таго прэзыдыум ЦП вызначыў прэміяльны фонд з 4.000 руб., з якіх 2.000 руб. на палянішэньне культурна-бытавых умоў работнікаў лепшых магазынаў і 2.000 руб. на індывідуальнае прэміяваньне 10-ці ўдарнікаў.

За ўдарную работу прэзыдыум ЦП прэміяваў гомельскае транспартнае спажыўтаварыства і бухгальтэрыю Бабруйскага ЦРК на 1.500 руб.

Замест дапамогі—перашкоды

Дубровенскае райспажыўтаварыства разбазарвае прадукты ЗРК

Для палянішэньня рабочага забесьпячэньня пры фабрыцы «Дубровенская мануфактура» арганізаваўся закрыты рабочы каапэратыў. Але з першых дзён свайго існаваньня каапэратыў натыкнуўся на рад сур'ёзных перашкод з боку Дубровенскага райспажыўтаварыства і адміністрацыі фабрыкі. 4 кастрычніка ЗРК было недадана 300 кгр. хлеба, 9-га кастрычніка — 400 кгр., а 10-га кастрычніка хлеб зусім ня быў адпушчан, ня гледзячы на тое, што напярэдадні ЗРК выдаў для пякарні райспажыўтаварыства каля 1 тоны мукі.

Райспажыўтаварыства разбазарвае фонды, вызначаныя для рабочых фабрыкі «Дняпроўская мануфактура». У трэцім квартале для рабочых фабрыкі была адпушчана 1 тона цукру і каля тоны алею. Але райспажыўтаварыства замест перадачы гэтых тавараў ЗРК цукар выдала гарадзкім найпшыкам, а алею ЗРК атрымаў толькі адну бочку.

У апараце райспажыўтаварыства «працуе» чужы элемэнт, які імкнецца стварыць антаганізм паміж найпшыкамі ЗРК і райспажыўтаварыства. Камісія па чыстцы савецкага апарату вычысьціла нейкага Фрадніна, але апошні да сёньняшняга дня працуе ў якасьці загалчыка магазыну райспажыўтаварыства. Гэты Фрадкін літаральна гоніць рабочых з магазыну.

Фабрычныя арганізацыі не стварылі належных умоў для работы ЗРК. Канкрэтная дапамога не адчуваецца. Да гэтага часу ЗРК ня мае бухгальтара, рахункавода і г. д. Дырэктар фабрыкі прадаставіў для праўленьня два пакоі, але на другі-ж дзень адзін пакой адабраў. ЗРК не разгарнуў загатовак, не паладзіла сваёй работы сталоўка.

Мясцовыя арганізацыі пазбавілі безадкладна дапамогі ЗРК перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і ўраду. Трэба даць на руках галаваценням з райспажыўтаварыства, якія перашкаджаюць ЗРК палепшыць абслугоўваньне рабочых фабрыкі «Дубровенская мануфактура» і разбазарваюць яго прадукты.

Г.

Калі будзе выканана пастанова ЦП саюзу работнікаў мастацтва?

Два месяцы таму назад, паводле пастановы мясцкому Дзяржтэатру, зацьвярджанай прэзыдыумам ЦП саюзу работнікаў мастацтва, павінен быў быць работнікаў мастацтва, павінен быў быць звольнены з работы адміністратар Дзяржтэатру Савінкаў — за безгаспадарчасьць тэатру Савінкаў — за безгаспадарчасьць кіраўніцтва відовішчнымі прадпрыемствамі ігнаруе гэту пастанову і Савінкаў застаецца на рабоце.

Савінкаў у мінулым выявіў сябе, як антысэміт. Адпойны, будучы п'яным Савінкаў спаткаўшы яўрэя-музыку, накінуўся на яго і з антысэмітскімі выкрыкамі зьбіў яго. Зараз Савінкаў зрабіў яшчэ адно злачынства: будучы ўпаўнаважаным беларускага аддзяленьня «Сюжэта», Савінкаў, пасьля ліквідацыі гэтага аддзяленьня і пераходу ў «Белгамец», не зрабіў грашовай справаздачы і прысвоіў 112 руб. казённых грошай, матывуючы тым, што яму належыць водпуск. Зразумела, што такім пазыцыям спагнаць ад дзяржаўнай установы грошай за водпуск, «Белгомец» ніколькі раз прабаваў спагнаць гэтыя грошы ад Савінкава, але бяз посьпеху.

Калі будзе выканана пастанова ЦП саюзу?

Ведаючы

Паведамленьні

— Сьпіс т. т., вылучаных для правядзеньня дакладаў аб 14 гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі: Гей (ЦК КП(б)Б) — чыгунка цягі, Калнін — (ЦКК КП(б)Б) — чыгунка руху, Чарвякоў (ЦВК) — чыгунка шляху, Шаранговіч (ЦК КП(б)Б) — зав. імя Варашылава, Гападзед (СНК) — фабрыка «Кастрычнік», Кавальчук (ГК КП(б)Б) — зав. «Камунар», Шпэктараў (ГК КП(б)Б) — зав. «Бальшавік», Кеніг (ГКК КП(б)Б) — «Полымя рэвалюцыі», Грыцкевіч (ГК КП(б)Б) — зав. «ДА», Красіна (рэд. «Рабочай») — фабрыка імя Крупскай, Хацкевіч (НКФ) — абутковая фабрыка, Захарава (Галоўкіраўніцтва шчадкас) — фабрыка імя 8 сакавіка, Хаскін (БКС) — «Камунарка», Ізенкоў (ЦКК КП(б)Б) — друк. імя Сталіна, Масюкоў (НКЗем) — шкловавод, Дамброўскі (ЦСПСБ) — Эльвод, Курцін (ЦК КП(б)Б) — «Ударнік», Клімковіч (ЦСПСБ) — «Чырв. Тэкстыльшчык», Шпілеўскі (ВАН) — «Усход», Балцін (НКСнаб) — Хлебазавод, Кавалеў (ЦСПСБ) — шчотачн. фабрыка, Цэнцыпэр (НКАховы адар.) — хэмфармазавод, Аксючыц (Галоўкіраўніцтва) — Белдзяржбуд, Баскін (НКПрацы) — Менбуд, Балуга (НКАсьветы) — «Пралетары», Шэйман (БКС) — «Беларусь», Дубіна (упаўн. НКПіТ) — «Беларуская», Шапіра (Дзяржплан) — скарняжная фабрыка, Амбражунас (ВСНГ) — лямпавая фабрыка, Васкабойнікаў (НКСнаб) — «Чырв. Зорка», Абрамсон (НКФ) — шчацінная фабрыка, Страпе (Белкалгасцэнтр) — мясакамбінат, Вародька (гарсавет) — Транспартгрэст, Ляўкоў (НКЮ) — Савэтранс, Стракоўскі (БКС) — «Чырв. хэмік», Розін (НКСнаб) — сьпіртазавод, Фэльдман (Дзяржбанк) — Уніль, Гурвіч (ЦКК КП(б)Б) — УМТ, Вапасевіч (ВСНГ) — шпалерная фабрыка, Шапіра НКЮ) — абутковая майст. гарсавету, Якаўлаў (Бел. Кір. Сувязі) — УЭА, Каменштэйн (ЦСПСБ) — калект. прадпр. харчавікоў, Хадасевіч (гарком КП(б)В) — ЦПП, Гапаскок (Белкамунбанк) — БСКА, Сьвірыдаў (Лесбел) — Белсампрамсаюз, Разорвовымі дакладчыкамі: Гурскі (НКАсьветы), Каранеўскі (гарсавет), Вансоўскі (ЦВК), Аверын (ЦКК КП(б)Б), Міхайлаў («Калг. Беларусі»), Фрыдман (ГКК КП(б)Б), Плішакоў (ЦСПСБ), Дунец. («Акцябр»), Саевіч (Камвуз), Міленькі (Лесбел), Прынц («Орка»), Мітлін («Зьвязда»), Каждан (ГК КП(б)Б). Сакратаром партколектываў і ячэек КП(б)Б безадкладна зьвязацца з вылучанымі т. т., паведамляючы аб часе і месцы сходаў, а таксама пазрыхтаваць для дакладчыка матар'ял аб становішчы іх прадпрыемстваў.

— Культпроп Менгаркому і ЦК 2 лістапада г. г., у 6 гадз. веч., у памяшканьні (3-ці паверх, заля пасяджэньняў) склікаецца мэтад. канфэрэнцыя ВНУ і ВТНУ на пытаньні: 1) Аб тыпавым мэтадзе выкладаньня: а) вышэйшай дысцыпліны (дакл. тав. Гершэльман), б) дакладных дысцыплін (дарэктар хэм-тэхн. інстытуту). 2) Аб комплектаваньні і рабоце брыгад (пэдінстытут — Рудніцкі). 3) Практыка прадпрыемстваў і мэтаду выкладаньня (Будінстытут — Шаліма). Прадстаўніцтва: дырэктар навучальнай установы, дэканы факультэтаў, загадчыкі навучальнай часткі, два навуковыя працаўнікі і два прадстаўнікі ад студэнтаў, сакратары п/к, старшыні прафсаюзаў. Запрашаюцца прадстаўнікі ВНУ і іншых гарадоў БССР.

— 31 кастрычніка, у 6 гадз. веч., культпропе ЦК, пакой № 15 адбудзецца нарада ўсіх гісторыкаў — членаў т-ва гісторыкаў-марксыстаў, якія працуюць па пытаньні гісторыі заходу.

— 31 кастрычніка, у 5 гадзін вечара у Культпропе ЦК КП(б)В адбудзецца нарада ўсіх навуковых працаўнікоў-аспірантаў) — камуністаў, што працуюць у галіне матэматыкі, фізыкі, біології, медыцыны і інш. прыродазнаўчых дысцыплін. Яўка абавязкова.

— 31 кастрычніка, у 6 гадз. веч., памяшк. Менгаркому КП(б)В (заля пасяджэньняў) адбудзецца сход прапагандыстаў ВСПШ. Яўка абавязкова.

— Менгарком КП(б)В 1 лістапада г. г., у 7 гадз. веч., у залі пасяджэньняў Менгаркому КП(б)В (3-ці паверх) склікае нараду жанарганізатараў ваенных творчых і будаўнічых партколектываў і цэхавых ячэек КП(б)В на пытаньні аб вынніках справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў. На нарадзе будуць стаяць даклады з месц, і яму кожны жанарганізатар павінен выступіць з матар'ялам на гэтым пытаньні. Сваячасовая яўка абавязкова.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Менгарком КП(б)Б, Гарк. КК і рэдакцыя газ. „Рабселькор"
і пісьменнікі
АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ РАБКОРАЎ,
членаў рэдакцыйных калегіяў, штодзённых і шматтыражных газет прадпрыемстваў, совгасаў, канцэрацыйных і навучальных устаноў г. Беларусі
з парадкам дня:
1) Аб сумесным рабоце органаў КК-РСІ і рабкораў (дакл. т. Кеніг).
2) Аб разгортваньні работы штодзённа.
Пасьля зьлёту—частавая частка.
Зьлёт адбудзецца ў пляцовачнай залі Дому Камасьветы ў 6 гадз. веч.
Білеты атрымаць у Культпропе Гаркому, пакой 19.
На зьлёт запрашаюцца прадстаўнікі ЦКК-РСІ і рэдакцый цэнтральных газэт.
Менгарком КП(б)Б
Менгарком РСІ
Рэдакцыя газ. „Рабселькор"

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Ад суботы, 31 кастрычніка
Новы савецкі фільм
вытворчасьці САЮЗКІНО
БОЙКІ ЖЫЦЬЦЯ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ:
ГУКАВЫ ФІЛЬМ
Пачатак у 7, 8-45 і 19-30. КАСА—з 5 гадз.
Асобы, якія спазьніліся, не дапускаюцца.

Інтэрнацыянал Адкр. з 12 г. дня
„КУЛЬТУРА" Пач. 7; 8-45; 10-30
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня
„Юны Піянэр" (Сусьвітны кіно „Культура")
„СПАРТАК" Каса адкрыта з 5 г.
Мастацкі фільм Лявон Куцюр'е
Новы фільм ЛЕДАЛОМ
Звыш праграмы БАЯВЫ ФРОНТ
ДЗЯЎЧЫНА З ПАЛУБЫ
Звыш праграмы ВЦІЧНАЯ ТАЙГА.
Арыгінальная камэдыя ДЖОЙ І ДРУЖОК
Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.
Выдатны фільм Асобая Далёка-Усх. армія
зганяя ў 7 частках

АБВЕСТКІ
— 1 —
ПАВЕДАМЛЕНЬНІ
ў чарговы нумар
„ЗЬВЯЗДЫ"
прымаюцца
толькі
да 2-х гадз. дня

СЕНЬНЯ ў 7 вадзін вечара, у залі пасяджэньняў ЦСПСБ (Дом Працы, 2-гі паверх, пакой 10)
БалМБІТ сумесна з ГарМБІТ склікае
НАРАДУ
ўсіх кіраўнікоў рэспубліканскіх і мясцовых бюро ІТС.
З прычыны важнасьці пытаньня кіраўнікоў абавязковая.
Бел. і ГарМБІТ.

Выдавецтвы „Зьвязда" просіць [illegible] падпісчыкаў
[illegible] на газэты „Зьвязда", „Орка", „Праф. Беларусі", „Рабселькор" і часопісы „Бальшавік Беларусі" і „Бел. Рабочы і Калгасьнік",
а таксама ў пункты выдавецтва прыватных прадаўцоў, з адказнасьцю [illegible] у сваёй бліжэйшай паштовай адзяленьне, што забясьпечыць [illegible] выданьні.

СЕТКА РАДЫЁВЯШЧАНЬНЯ

праз Менскую радыёвяшчальную станцыю імя Саўнаркому Беларусі РВ—10, на хвалі 700 мтр. 428,6 кілёцыкл.

НА АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫ ПЭРЫЯД 1931-32 г.

6.00—8.30 **штодзённа:** фізкультура і музыка.

8.30—9.30 **штодзённа:** канцэрт—трансьляцыя Масквы

10.00—11.00 Інструктаж мясцовых арганізацый па папярэднім выліку

11.00—13.00 **штодзённа:** рабочы поўдзень—трансьляцыя Ленінградзкіх і Маскоўскіх радыёстанцый.

13.00—14.00 **штодзённа:** падрыхтоўка кадраў сельскай гаспадаркі.

14.00—15.00 **штодзённа:** перадача радыё-грам: урадавых арганізацый, партыйных, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый.

15.00—16.00 **штодзённа:** інфармацыя-інструкцыя для рабочых і калгасных газэт.

16.30—17.00 **штодзённа:** канцэрт.

17.00—18.00 **штодзённа:** перадача Інстытуту масавага заочнага навучаньня пры ЦК КП(б)Б.

18.00—18.30 **штодзённа:** газэта „Піянэр Беларусі" з музычнай ілюстрацыяй: 5, 10, 15, 20, 25, 30 газэта „Чырвонаармейская Праўда".

18.30—19.00 **штодзённа:** падрыхтоўка кадраў для прамысловасьці.

19.00—19.30 **штодзённа:** канцэрт.

19.30—20.15 **штодзённа:** газэта „За бальшавіцкія тэмпы".

20.15—21.00 **штодзённа:** газэта „Калгасны заклік"

21.00—21.30 **штодзённа:** газэта „Камсамолец Беларусі"

21.30—22.00 **штодзённа:** падрыхтоўка кадраў для прамысловасьці.

22.00—22.30 2, 4, 6, 8, 10, 12, 14, 16, 18, 20.22, 24, 26, 28, 30 (па чотных лічбах)—газэта на яўрэйскай мове „Ленінскі Шлях".
1, 3, 5, 7, 9, 11, 13, 15, 17, 19, 21, 23, 25, 27, 29, 31 (на нячотных лічбах)—газэта на польскай мове „Орка".

22.30—23.00 1, 4, 7, 10, 13, 16, 19, 22, 25, 28, 31—газэта на латышскай мове „За сацыялістычныя тэмпы".
3, 6, 9, 12, 15, 18, 21, 24, 27, 30—газэта на літоўскай мове „Раўдонасіс Артоас".
2, 5, 8, 11, 14, 17, 23, 26, 29—курсы на польскай мове.

23.00—24.00 **штодзённа:** канцэрт сатыры, або канцэрт па трансьляцыі і рабочых клюбах, радыёстанцый СССР і замежных.

00.00—00.30 1, 3, 4, 6, 7, 9, 10, 12, 13, 16, 19, 21, 23, 24, 25, 27, 28, 30, 31—вячэрні выпуск газэты „За бальшавіцкія тэмпы".
8, 17, 26—даклады на мове эсперанто.
2, 5, 11, 14, 20, 23, 29—газэта на мове эсперанто „Чырвоная Беларусь".

Нам. загадчыка Культпропу ЦК КП(б)Б РАМАНЧУК.
Загадчык аддзелу мясцовага Радыёвяшчаньня БССР НАЎМЕНАК.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ
Рэкамэндацыйны сьпіс літаратуры да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.
1. Халепа.—XIV год Кастрычніцкай рэвалюцыі Ц. 20 кап.
2. Агурскі С.—Нарысы па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Беларусі (1863—1917 г.) Ц. 1 руб.
3. Кнорын В.—1917 г. у Беларусі і Заходнім фронце Ц. 15 кап.
4. Каган і Траяноўскі—Вайсковае паўстаньне ў 1905—1907 г. Ц. 20 кап.
5. Падвойскі А.—Першы Савет Рабочых дэпутатаў Ц.